

(НЯ)ЛЁГКІ СПОСАБ КІНУЦЬ КУРЫЦЬ 3




ГАННА КУБАРАВА ПРА ТЭНІС І БАЦЬКУ-ФУТБАЛІСТА 8


30 МАЯ 2020 г. СУБОТА

№ 104 (29218)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


З першых вуснаў

# «МЫ БУДЗЕМ РАБІЦЬ УСЁ ДЛЯ ТАГО, КАБ ВЫ ПРАЦАВАЛІ»

## На МТЗ Прэзідэнт гаварыў пра імпартазамяшчэнне, якасць прадукцыі, падтрымку айчынных вытворцаў і палітыку, якая сёння наўпрост звязаная з эканомікай

**Да 2030 года Мінскі трактарны завод плануе выйсці на асваенне беспілотнага трактара. Пра гэта Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку ўчора праінфармавалі падчас яго візіту на ААТ «МТЗ».**



Фота БелТА.

Учора МТЗ споўнілася 74 гады. Павіншаваць трактарабудаўнікоў Прэзідэнт завітаў асабіста, але ніводнае свята ў Аляксандра Лукашэнкі не абыходзіцца без абмеркавання надзённых праблем. І ў вырашэнні многіх няпростых пытанняў Мінскі трактарны завод можна прывесці ў прыклад.

Гэта прадпрыемства, якое працуе стабільна, і дзясяткі тысяч супрацоўнікаў відавочна радуюцца таму, што жывуць у Беларусі, бо невядома, ці былі б у іх работа і заробак у іншай краіне. А МТЗ сёння не проста працуе, а актыўна праводзіць мадэрнізацыю. І самае галоўнае, на што звяртае ўвагу Аляксандр Лукашэнка, — пытанне нумар адзін — імпартазамяшчэнне.

### Навучыць зарабляць

«Работа ёсць, працуем», — далажыў Прэзідэнту генеральны дырэктар МТЗ Віталь Воўк.

«Тое, што я казаў: ***нам не трэба з верталёта грошы раскідваць. Так, трэба зарабіць***, але пытанне, ці ёсць рабочыя месцы. Дапусцім, з таго ж раённага цэнтра (ды і ў Мінску) — інтэрнат даюць, паўтары тысячы, лічы, зарплата — і не пайсці, не папрацаваць? Чаго чакаем? З верталёта грошай не будзе», — агучыў пазіцыю кіраўнік дзяржавы.

«На багатым Захадзе ўжо дзікае беспрацоўе, людзі каструлямі барабаняць, людзі хочуць есці. Дзякуй богу, мы гэтага пазбеглі, не закрыліся», — працягнуў Прэзідэнт.

Як далажыў кіраўніку дзяржавы Віталь Воўк, холдынг з дзесяці прадпрыемстваў і трох сельскіх гаспадарак працуе даходна. На ўсіх рост прадукцыйнасці працы перавышае рост зарплаты. Сітуацыя з каранавірусам, вядома, паўплывала, але і яна выправіцца.

МТЗ мае, што прадаваць, і ведае перспектывы развіцця. У планах — адкрыць вытворчасць у Еўропе, Лацінскай Амерыцы, Егіпце і Расіі. Віталь Воўк паведаміў кіраўніку дзяржавы, што сёння экспарт прадукцыі перавышае 540 мільёнаў долараў, а павялічыць яго ў холдынгу імкнуцца да 1347 мільёнаў долараў. Маштабы мадэрнізацыі такія, што фактычна да 2030 года будзе пабудаваны новы завод.

Ліцейная вытворчасць у перспектыве павысіць прадукцыйнасць з 150 тысяч тон да 300 тысяч тон, з'явіцца механаапрацоўка. Па словах Віталя Воўка, сёння ў Бразіліі і Кітаі ёсць падобныя цэнтры — Беларусь можа стаць трэцім апаратарам. Такая вытворчасць дазволіць не толькі забяспечыць уласныя заводы, але і прадаваць ліццё на экспарт.

Кіраўніку дзяржавы прадэманстравалі машыны для камунальных службаў, лясную і зімнюю тэхніку, найноўшыя трактары, у тым ліку мадэлі з рухавікамі беларускай вытворчасці, якія рыхтуюцца да выпрабаванняў.

Мэта, якую ставіць завод да 2030 года, — асвоіць беспілотны трактар.

У корпусе зборкі трактароў Прэзідэнт вывучыў дзейнасць прадпрыемстваў — пастаўшчыкоў па імпартазамяшчэнні. Як адзначылі вытворцы, цяпер усе яны нарэшце ў адной лодцы: будуць якасныя камплектуючыя — гэткая самая атрымаецца канчатковая прадукцыя. ***«Задача нумар адзін — каб мы сваё выкарыстоўвалі на ўсю катушку.*** Таму імкніцеся якасна рабіць. Пытанне нумар адзін — гэта імпартазамяшчэнне. ***І другое — абарона рынку»***, — звярнуў увагу беларускі лідар.

Прэзідэнт падрабязна цікавіўся ўмовамі працы работнікаў на кожным прадпрыемстве. Галоўнае патрабаванне, якое ўжо неаднойчы гучала: каб былі захаваныя калектывы і людзі ведалі, што іх будучыня забяспечана.

### Быць лепшымі за канкурэнтаў

Віншаванні з днём нараджэння прадпрыемства Прэзідэнт агучыў на асабістай сустрэчы з супрацоўнікамі МТЗ. Пасля наведвання цэха Аляксандра Лукашэнку чакалі на размову з працоўным калектывам. «Гэта выдатны завод, гэта твар нашай краіны, гэта брэнд. ***Беларусь тут сканцэнтравана»***, — акрэсліў ён асаблівую значнасць прадпрыемства. «Мы будзем рабіць усё для таго, каб вы працавалі», — запэўніў Прэзідэнт прысутных.

Прыватызацыя такіх буйных, найважнейшых для дзяржавы вытворчасцяў — складанае пытанне. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што некаторыя людзі цяпер прапануюць распрадаць дзяржаўныя прадпрыемствы, а атрыманыя грошы накіраваць на рэформы.

«Я ж ужо не першы год Прэзідэнт: прададуць, але грошы не пойдуць на рэформы. Мы гэта ўжо бачылі ў Расіі. Грошы раскладуць па кішэнях, будзьце пэўныя, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Гэта не мая палітыка — прыватызацыі. ***Я не супраць продажу дзяржаўнай уласнасці, але спачатку вы скажыце, колькі заплаціце.*** А я падумаю, ці трэба прадаваць гэта прадпрыемства».

На электронным табло, што над галоўным уваходам на завод, супрацоўнікаў сустракае надпіс: «Будзьце найлепшымі, іначай за вас гэта зробяць канкурэнты».

Пра гэта нагадаў супрацоўнікам і Прэзідэнт — такога тавару, як трактары, у свеце шмат. «І немцы, і амерыканцы, — усе ствараюць трактары. І нам даводзіцца канкурыраваць, — сказаў ён. — Я сам часам на трактары працую, мне гэта цікава. Але раз-пораз атрымліваю скаргі ад сялян і сам думаю, калі мы якасць не паднімем, нічога не будзе».

### Хвароба ці палітыка?

Першае пытанне ад завадчан — пра эпідэміялагічную абстаноўку ў краіне. Прэзідэнт адзначыў, што ў сталіцы захваральнасць павольна ідзе ўніз: «Ужо не такая хвароба, як была ў пачатку эпідэміі, ужо не такія цяжкія хворыя». Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што кантралюе сітуацыю не столькі па колькасці хворых, колькі па смяротнасці.

«Пацыху лячылі. Глядзелі за людзьмі, лекаў не было. Ніхто не ведаў, як лячыць, спрабавалі тое, гэта. ***Зараз мы ведаем, якія лекі трэба каму»***, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і прывёў у прыклад сітуацыю са сваім фатографам, які нядаўна вярнуўся ў строй пасля цяжкай хваробы.

СТАР. 2

Дарогамі Славы

75 Вялікая Перамога

# Кулямётчык і мінамётчык

З сапраўднымі легендамі мінулай вайны Паўлам Рубісам і Віктарам Вятошкіным мне пашчасціла сустрэцца ў майскія дні восемдзесят дзявятага года. У той час Віктару Дзмітрыевічу толькі што споўнілася шэсцьдзясят чатыры гады, Павел Іванавіч быў на два гады старэйшы. Ужо адцвіталі яблыневыя сады, пачыналася бэзавая «эра»: густы водар кветак лунаў над вуліцамі прыватных сядзіб. Менавіта з майскім адценнем і атрымаліся гэтыя партрэты: жыхар пасёлка Расоны Павел Рубіс застыў перад фотааб'ектывам з букецікам бэзу, а гамяльчанін Віктар Вятошкін пазіраваў пад белымі антонаўкамі. Даўно няма з намі Паўла Іванавіча, а Віктар Дзмітрыевіч пакінуў свет пяць гадоў таму, але тыя невыпадковыя сустрэчы застаюцца ў памяці, прымушаюць перабіраць фотаздымкі і перагортваць блакноты з іх ваеннымі ўспамінамі.

На фронце вясковыя хлопцы аказаліся пасля вызвалення Беларусі. За плячыма Паўла была ўжо партызанская барацьба, і ён лічыўся «абстраляным мальцам».

— У палявую часць нас забралі ўтрох з аднаго партызанскага атрада, — успамінаў Павел Іванавіч свой першы бой на фронце — пад вёскай Сіроціна Шумілінскага раёна. — Страшны бой — сапраўднае баявое хрышчэнне. Аднаго таварыша параніла, другога забіла асколкам у галаву, мой станковы кулямёт перабіла. З шасцідзесяці салдат засталося толькі васямнаццаць...



З успамінаў Віктара Вятошкіна: «З нашых вёсак Старая і Новая Мільча пайшло на фронт амаль усё мужчынскае насельніцтва. У адным баі мой аднавясковец Іван Жалязнякоў быў смяротна паранены. Пасля вайны і вяртання дадому яго маці часта мяне папракала: чаму не збераглі яе сына?» А самога Віктара на радзіме чакалі бацькі і дзве сястры.

СТАР. 3

# НАЙЛЕПШАЯ ВАДЗІЦА — СА СВАЁЙ КРЫНІЦЫ



**Яшчэ адной славутасцю вёскі Бабінавічы Лёзненскага раёна стала старажытная крыніца, з якой бралі ваду і для выпечкі хлеба, і для салення капусты і агуркоў, і нават для прыгатавання гліны ў ганчарнай справе: бабінавіцкі гліняны посуд і свістулькі мелі вялікі попыт у жыхароў аршанска-віцебскага памежжа. Крыніца доўгі час была закінута, пра ўласцівасці вады забылі. І вось нераўнадушныя жыхары-аднавяскоўцы адрадзілі выток, паставілі над ім калодзежнае кола. Сярод руплівцаў быў і Яўген БАГДАНОВІЧ — аматар прыроды і гісторыі свайго краю.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Нерухомасць

# ХОЦЬ «МЯДЗВЕДЖЫ КУТ»,

## абы з выгодамі і пральнай машынай

**«Здыму лецішча пад Мінскам, не далей за 50 кіламетраў ад МКАД. Пажадана з выгодамі ў доме. Маляўнічае месца, лес і вадаём паблізу вітаецца. Разгледжу ўсе варыянты. Выберу нядорага». Так выглядае аб'ява ў інтэрнэце маладой сям'і ці пары, якія зразумелі, што сёлета адпачываць за мяжу яны, хутчэй за ўсё, не паедуць. Вось толькі «нядорага» ва ўсіх рознае...**

### Усплёск быў крыху раней, але і даражэй

Гэтай вясной на рынку арэнды жылля ў сталіцы з'явіўся новы трэнд: многія хацелі самаізалявацца на прыродзе.

Традыцыйна ў сярэдзіне вясны актывізуюцца арандатары загараднага жылля на летні перыяд, але ў гэтым сезоне такіх кліентаў стала яшчэ больш. Сёння да спажыўцоў, якія шукаюць дом на лета для сябе і сваёй сям'і, дадаліся і тыя, хто сур'ёзна разглядае «фазэнду» як месца для ізаляцыі ад вялікай колькасці людзей. А вось летась асаблівага ўсплёску попыту на арэнду загараднай нерухомасці не назіралася. І калі параўнаць май гэтага года з маем мінулага, то можна смела сказаць, што попыт узрос больш чым на 40 %.

Як адзначыла **начальнік аддзела арэнды жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ**, пераважна новымі жыхарамі вёскі сталі прадстаўнікі бізнесу, якія могуць працаваць на дыстанцыі. Яны разглядаюць варыянты паблізу Мінска, куды можна замовіць дастаўку прадуктаў і іншых неабходных тавараў, — напрыклад, Бараўляны, Калодзішчы, Гарадзішча. Там можна застацца побач з усёй неабходнай інфраструктурай, у першую чаргу з паліклінікамі і медыцынскімі цэнтрамі, і пры гэтым звесці да мінімуму кантакты.

СТАР. 2

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Трамп падпісаў указ аб рэгуляванні дзейнасці сацсетак



Гэты дакумент дазволіць змяніць палажэнні заканадаўчага акта, прынятага ў ЗША чвэрць стагоддзя таму. Паводле аднаго з артыкулаў, кантэнт, размешчаны ў сацыяльных медыя, не мог быць прадметам крымінальнага пераследу трэціх асоб. Прэзідэнт ЗША заяўляе, што мэта яго дзеянняў — «абарона свабоды і дэмакратыі», бо вялікія анлайн-платформы атрымалі, як ён выказаўся, «некантраляваную ўладу» і могуць цэнзураваць і абмяжоўваць любы кантэнт па сваёй волі, перадае Euronews. Гэты крок Дональд Трамп зрабіў у разгар палемікі наконт спосабаў галасавання на будучых выбарах. Днямі Twitter пазначыў дзве публікацыі прэзідэнта ЗША як тыя, што «маюць патрэбу ў праверцы выкладзеных фактаў». Марк Цукерберг, выступаючы ў якасці арбітра, паведаміў, што не справа Facebook правяраць дакладнасць звестак, якія публікуюцца на гэтай платформе. Кіраўнік мінюста ЗША Уільям Бар заявіў, што яго ведамства рыхтуе законапраект, які дапоўніць палажэнні ўказа прэзідэнта. Амерыканскі лідар прамовіў, што замяшаныя ў цэнзуры або палітычных дзеяннях сацсеткі больш не будуць абаронены ад адказнасці. Адказваючы на пытанні журналістаў, Трамп заявіў, што дапускае магчымасць закрыцця Twitter.

ISSN 1990 - 763X

20104>

9 771990 763008

### У Тунісе пачаліся масавыя пратэсты з-за беспрацоўя




У гарадах Туніса сотні людзей наладзілі пратэсты з патрабаваннем даць ім рабочыя месцы, паведаміў «Інтэрфакс». Пратэсты ўспыхнулі на фоне двухмесячнага эканамічнага крызісу. Чакаецца, што сёлета эканоміка краіны скароціцца на 4,3 працэнта, што з'яўляецца самым рэзкім падзеннем больш чым за 60 гадоў. На поўдні горада Гафса выпускнікі ВНУ сабраліся каля будынка адміністрацыі горада, выкрыкваючы: «Нам патрэбныя рабочыя месцы!» Сотні іншых дэманстрантаў выйшлі на вуліцы ў гарадах Хаджыб-Эль-Аюн і Сідзі-Бузід. Менш маштабныя пратэсты ўспыхнулі ў гарадах Бэджа, Касерын, Тозеўр і Сфакс. Паводле афіцыйных звестак, узровень беспрацоўя ў Тунісе складае 15,3 працэнта. У маі ўрад краіны пачаў адмяняць каранцінныя абмежаванні і забароны на перамяшчэнне і дзейнасць прадпрыемстваў. Гэта дазволіла вярнуцца на работу прыблізна 75 працэнтам супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў. Туніскія гатэлі могуць адкрыцца 4 чэрвеня. У гэты ж перыяд будзе адноўлены рух паміж рэгіёнамі краіны, каб прыцягнуць унутраных турыстаў.

### Boeing аднавіў вытворчасць самалётаў 737 MAX

Пра гэта паведамляецца на сайце кампаніі. Самалёты на заводзе ў горадзе Рэнтан (штат Вашынгтон) будуць вырабляць невысокімі тэмпамі, бо кампанія павінна выкарыстаць больш за дзясятак новаўвядзенняў для павышэння бяспекі супрацоўнікаў і якасці лайнераў. Але хуткасць зборкі будзе на працягу года паступова павышацца, паведамляе Forbes. «Мы прайшлі вялікі шлях, каб палепшыць нашу сістэму вытворчасці і зрабіць яе яшчэ мацнейшай», — заўважыў віцэ-прэзідэнт Уолт Адзіш. Як вядома, вытворчасць Boeing 737 MAX была прыпынена пасля таго, як адпаведныя лайнеры па ўсім свеце спынілі палёты. Прычынай сталі авіякатастрофы ў Інданезіі і Эфіопіі, якія адбыліся з розніцай пяць месяцаў, — іх ахвярамі сталі 346 чалавек. З-за крызісу гендырэктар кампаніі Boeing Дэніс Мюленбург пакінуў сваю пасаду.

## КОРАТКА

- **Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту ў студзені—красавіку склаў Br0,6 млрд**
- Узбекістан мае намер атрымаць статус назіральніка ў ЕАЭС.
- **Нарач узначальвае топ-5 курортаў СНД для лячэбна-аздараўленчага адпачынку.**
- У Брытаніі ва ўзросце 112 гадоў памёр самы стары мужчына ў свеце.



- Абітурыенты змогуць аддалена атрымаць меддаведку для паступлення.
- **Кіроўцаў пасля прыняцця абноўленага КаАП будуць пазбаўляць правоў пры наборы больш чым 10 балаў.**
- У Віцебску заўважылі лася. Маладая жывёла зайшла на вуліцу Герцэна.

Сацыяльны вектар

# ІНТЭРНАТАЎ І СІРОТ УСЁ МЕНШ

## Дзякуючы ў тым ліку інфармацыйным тэхналогіям

**Летась у Беларусі без апекі бацькоў засталіся 2098 дзяцей, і гэта найменшы паказчык за апошнія больш чым дзесяць гадоў. Звыш за 80 % сірот і малых, якія засталіся без апекі бацькоў, сёння выхоўваюцца ў сем'ях. Акрамя таго, інтэрнатных устаноў у краіне з кожным годам становіцца ўсё менш. Напярэдадні Міжнароднага дня абароны дзяцей спецыялісты расказалі, як у Беларусі клапоцяцца пра сірот.**

У краіне функцыянуе 142 сацыяльна-педагагічныя цэнтры (СПЦ), каб усе дзеці, якіх выхоўваюць не ў роднай сям'і, маглі атрымаць падтрымку не толькі ад апекуна ці папячыцеля, але і ад спецыялістаў: псіхолагаў, сацыяльных педагогаў і іншых.

Летась з-за адсутнасці «пастаяльцаў» закрылі два прытулкі ў Магілёўскай і Брэсцкай абласцях. А сярод устаноў, дзе выхоўваліся толькі дзеці-сіроты і малыя, якія засталіся без апекі бацькоў, у 2019-м зачыніліся два дзіцячыя дамы і Ашмянская школа-інтэрнат. Сёлета перастане існаваць і Гомельскі дзіцячы дом. І гэтая дынаміка закрыцця дзіцячых інтэрнатаў — сведчанне добрай работы па ўладкаванню малых у сем'і, упэўнена **Алена СІМАКОВА, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі.** Цяпер у Беларусі працуе 101 сацыяльны прытулак у 142 СПЦ.

Самы эфектыўны рэсурс, які спрыяе ўладкаванню сіраты на сямейную форму выхавання, — рэспубліканскі інтэрнэт-партал «Дадому.бай» (http://dadomu.by/). За сем гадоў яго існавання тут было зарэгістравана больш за 25 тысяч карыстальнікаў. На партале захоўваюцца звесткі пра 3,5 тысячы дзяцей, у тым ліку 624 відэаролікі пра дзяцей. За гады яго існавання каля трох тысяч малых знайшлі прыёмныя сем'і.

— Сёлета мы плануем цалкам мадэрнізаваць партал, змяніць яго дызайн і напаўняльнасць, дадаць новыя функцыі і магчымасці, — заўважыла **дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі Беларусі Вольга ГЛІНСКАЯ.**

У Беларусі назіраецца тэндэнцыя, калі на ўсынаўленне прыходзяць не толькі пары, якія не могуць мець дзяцей, але і тыя, хто мае сваіх біялагічных дзетак і хоча яшчэ або ўжо выгадаваў сваіх, а бацькоўскі патэнцыял яшчэ не растрачаны. Не рэдкасць і пары, якія вяртаюцца па другога і трэцяга малога пасля ўсынаўлення першага.

**Ірына СІДАРОК.**

# «Мы будзем рабіць усё для таго, каб вы працавалі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік краіны асаблівую ўвагу ўдзяляе магчымай другой хвалі каранавіруса. Рыхтуючыся да яе, у сістэму аховы здароўя ўкладаюць шмат грошай.

Толькі 10 працэнтаў апаратаў ШВЛ, па словах Аляксандра Лукашэнкі, было задзейнічана ў працэсе лячэння — гэта прыкладна 250 адзінак. Сёння ў Мінску 6300 чалавек, хворых на COVID-19, знаходзіцца на дамашнім амбулаторным лячэнні. Адзінае патрабаванне — строга сядзець дома. Іх здароўе пад кантролем урачоў, а сумленнасць — пад наглядам міліцыі.



Фота БелТА

## Пра новы ўрад

Пацікавіўся рабочы завода і намерам кіраўніка краіны сфарміраваць новы склад урада. «Так, пацвярджаю. Я гэта кожны раз рабіў, **каб вы бачылі, калі я выйграю выбары, з кім я буду працаваць**, — заявіў лідар дзяржавы. — Я гэта казаў, і я гэта зраблю ў найбліжэйшы час».

«А праўда, што аднаму з альтэрнатыўных кандыдатаў вы да пачатку выбарчай кампаніі прапаноўвалі пасаду прэм'ер-міністра?» — задаў пытанне рабочы.

— Я вам шчыра скажу, гледзячы ў вочы, што гэтаму банкіру трэба падумаць, дзе ён будзе пасля выбараў працаваць. І наогул са школы і вас, і мяне вучылі: не хлусь. У Беларусі толькі адзін чалавек па Канстытуцыі мае права прапанаваць пасаду прэм'ер-міністра і ўнесці кандыдатуру ў парламент для зацвярджэння. Я нікому нічога не прапаноўваў. Тым больш яму — які вопыт у яго, каб быць прэм'ер-міністрам? — адказаў Прэзідэнт. — Таму я ніяк не мог прапанаваць і не прапаноўваў нікому на сённяшні дзень гэтую пасаду. У найбліжэйшы час вы ўбачыце. ***Я прызначу выканаўцу абавязкаў у гэтым урадзе***, і пасля выбараў, калі ён будзе добра працаваць, мы яго зацвердзім у парламенце.

## Універсальны сродак

Найлепшай рэкламай для МТЗ у час пандэміі, па словах работнікаў, стала фраза Аляксандра Лукашэнкі, што трактар вылечыць усіх. З гэтай нагоды Прэзідэнта спыталі, якія мадэлі тэхнікі прадпрыемства ў яго любімыя.

Трактароў у кіраўніка краіны два, адзін з іх — падарунак МТЗ, другі — даўняя пакупка.

«Трактар для мяне з дзяцінства — гэта ўсё. Не патрэбна ніякая машына, конь, калі ёсць трактар — універсальны сродак», — падзяліўся вопытам лідар дзяржавы.

Па традыцыі Прэзідэнт заўсёды пакідае прадпрыемства з падарункамі ад калектыву. Такія сувеніры ён накіроўвае ў музей Палаца Незалежнасці. Нядзіўна, што Мінскі трактарны завод прэзентаваў кіраўніку краіны трактар. Толькі гэтым разам — паменшаны макет BELARUS-4522, які зойме пачэснае месца ў адным з галоўных будынкаў краіны.

**Уражанні**

### КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ ЦІКАВІЦЬ КОЖНЫ ЖЫХАР

«Гэта вельмі вялікая падзея для трактарнага завода, асабліва ў дзень свята. Гэта для нас вялікі падарунак, што мы сёння асабіста ўбачылі Прэзідэнта. Праўда, не ўсім давялося задаць пытанні, але тым не менш гэта было цудоўна. Цікава было пачуць пра палітычную сітуацыю ў Беларусі і ў свеце ад яе кіраўніка. І мы сёння верым, упэўнены ў тым, што жыццё працягваецца, мы жывём і працуем», — сказаў Рамуальд Стасевіч, супрацоўнік МТЗ.

«Мы будзем працаваць вельмі доўга, якасна і мець вялікую зарплату, — падхапіла яго калега Лілія Бакуновіч. — Мне заўсёды падабаецца, як Прэзідэнт выступае: і пажартуе, і скажа нам праўду. Мы заўсёды пасля яго выступлення спакойна ідзём дамоў».

«Хваляванне, вядома, прысутнічала. Хацелася пачуць ацэнку якасці працы нашай, якасці прадукцыі. Ацэнка аб'ектыўная, цікавая і, галоўнае, карысная. Пазнавальна — для нас гэта вялікія перспектывы, ёсць да чаго імкнуцца. Мяне вельмі парадавала, што пандэміі ўдзяляецца вялікая ўвага, што кіраўніка дзяржавы цікавіць кожны жыхар. Вельмі здорава, што медыцына ў нас на дастаткова высокім узроўні. У заўтрашні дзень рушым упэўнена, усяго даб'ёмся, наперадзе ўсё будзе добра», — перакананы пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Аляксандр Пыжык.

«Адчувалі дабрыню і праўду — усё, што хацеў, пачуў. Прэзідэнт быў такі шчыры, такі надзейны. Размова была канструктыўная, і па кожным пытанні дадзены разгорнуты адказ. Цёплая атмасфера, бо самае страшнае — калі ў людзей абыякавасць у вачах, а тут людзі проста жывыя», — падзяліўся ўражаннямі Мікіта Серафімовіч.

**Варвара МАРОЗАВА,**
**Марыя ДАДАЛКА.**

Ва ўрадзе

# Аб'яднацца для аднаўлення эканомік

## Савет кіраўнікоў урадаў зацвердзіў Стратэгію эканамічнага развіцця СНД на перыяд да 2030 года

**Пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, як і шматлікія міжнародныя сустрэчы, адбылося ў фармаце відэаканферэнцыі. Але гэта не перашкодзіла ўдзельнікам выпрацаваць агульныя падыходы да надзённых пытанняў арганізацыі.**

Па словах **прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея РУМАСА**, выкліканы пандэміяй найглыбейшы спад у сусветнай эканоміцы вымушае шукаць ахоўныя механізмы і апорныя пункты развіцця ў рамках уласнага рэгіёна. Стратэгічнай мэтай кожнай дзяржавы з'яўляецца мінімізацыя негатыўнага ўплыву сітуацыі на насельніцтва і эканоміку, захаванне сацыяльна-эканамічнай і фінансавай стабільнасці.

«Аднак ва ўмовах узаемазалежнасці нашых прамысловых, сельскагаспадарчых і транспартных комплексаў вырашэнне гэтай задачы можа быць дасягнута толькі разам, сумеснымі намаганнямі нашых краін, — сказаў кіраўнік беларускага ўрада. — На мой погляд, надыходзіць час сістэмных дзеянняў па рэалізацыі агульнай эканамічнай стратэгіі, накіраванай на ўзмацненне самадастатковасці Садружнасці, у першую чаргу ў сферах, якія забяспечваюць здароўе і жыццядзейнасць людзей».

Сяргей Румас прапанаваў Выканкаму СНД у найбліжэйшы час арганізаваць пасяджэнне галіновых камітэтаў для абмеркавання абумоўленых пандэміяй пытанняў, якія прыводзяць да парушэння гандлю і транспартных зносін, распрацаваць меры для павышэння надзейнасці функцыянавання кааперацыйных сувязяў, акрэсліць сумесныя прыярытэты развіцця з факусіроўкай на галінах, якія ў цяперашні час маюць вырашальнае значэнне для стрымлівання распаўсюджвання віруса, прадумаць магчымасць стварэння канверсійных вытворчасцяў для патрэб рэгіёна ў надзвычайных сітуацыях.

Прэм'ер-міністр Беларусі акцэнтаваў увагу на неабходнасці завяршыць работу краін СНД над стварэннем зоны свабоднага гандлю паслугамі.

«На наш погляд, ключавой задачай з'яўляецца далейшае раскрыццё патэнцыялу дамовы аб ЗСГ. Перш за ўсё гэта завяршэнне работы над стварэннем зоны свабоднага гандлю паслугамі, забеспячэнне безбар'ернага гандлёвага асяроддзя, спрашчэнне мытных працэдур, — падкрэсліў Сяргей Румас. — Мяркую, што паляпшэнне ўмоў узаемнага доступу на рынкі можа стаць сур'ёзным драйверам хутчэйшага аднаўлення нашых эканомік. Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы зможам эфектыўна пераадолець наступствы пандэміі і вярнуць нашы краіны на рэйкі ўстойлівага развіцця».

Па выніках нарады кіраўнікі ўрадаў прынялі пакет сумесных дакументаў, галоўным з якіх стала Стратэгія эканамічнага развіцця СНД на перыяд да 2030 года. У дакуменце адлюстраваны падыходы краін да мэт, асноўных задач, кірункаў супрацоўніцтва і механізмаў міждзяржаўнага ўзаемадзеяння ў эканамічнай сферы.

Наступнае пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў СНД пройдзе 6 лістапада ў Ташкенце.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ХОЦЬ «МЯДЗВЕДЖЫ КУТ»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але добраўпарадкаваныя дачы, прыстасаваныя для здачы ў арэнду цэлы год, каштуюць шалёных грошай. Вось, напрыклад, невялікі і просценькі гасцявы домік побач з сасновым борам за сем кіламетраў ад Мінска каштуе 840 рублёў у месяц — як вам? Вадаём непадалёк, ёсць інтэрнэт і нават абсталяванае месца для шашлыкоў. Здаецца на лета, але трэба ўнесці перадаплату за два месяцы. У каго такія грошы сёння лішнія?

## Купляем і арандуем па мінімуме

З-за пандэміі многія перагледзелі стаўленне да каштоўнасцяў. Нам зноў сталі даспадобы ўласны ўчастак, дом, агарод. Па словах **дырэктара агенцтва нерухомасці «Загарадны дом і кватэрны цэнтр» Уладзіміра ЧАРНУШЭВІЧА**, у прыгарадзе Мінска назіраецца высокі сезонны попыт на загарадную нерухомасць. З-за ранняй вясны дачы пачалі актыўна прадавацца яшчэ ў сакавіку. Пік продажаў прыйшоўся на красавік—май. Многія захацелі перабрацца з гарадоў бліжэй да прыроды — людзі спадзяюцца перачакаць там пандэмію. Назіраецца цікавая тэндэнцыя — уласнікі дач скасоўваюць дагаворы аб продажы, таму што вырашаюць захаваць за сабой домік, які стаў раптам патрэбны ім самім.

Пакупнікі ў асноўным арыентуюцца на недарагія дачы цаной ад 5 тысяч да 10 тысяч долараў. Больш капітальныя пабудовы з санвузлом у доме і лазняй каштуюць цяпер да 25—30 тысяч «зялёных».

Павышаны попыт на недарагія дачы сведчыць аб зніжэнні пакупной здольнасці. Цяпер амаль усе хочуць арандаваць дачу з мінімальнай цаной — да 100 долараў у месяц. За гэтыя грошы кліент хоча ўтульны домік з усімі выгодамі, абавязкова з нармальнай каналізацыяй і пажадана падключанай пральнай машынай. Вось тут і сутыкаецца сфера пажаданняў з рэальнасцю. На рынку сёння дастаткова недарагіх дач (200—300 рублёў у месяц), але яны амаль усе з камфортам сябруюць толькі напалову. Туалет у іх, як правіла, на вуліцы. Мыць рэчы давядзецца ўручную, а інтэрнэт, як і якасная сотавая сувязь, ёсць не заўсёды і не ўсюды. Пра гарачую ваду даводзіцца толькі марыць.

## У глуш, далей ад людзей

Усё большай папулярнасцю ў гарадскіх людзей карыстаюцца «мядзведжыя куты» — так на рыэлтарскай мове называюцца асобна размешчаныя ўчасткі ў ціхіх адасобленых месцах: зносіны з прыродай і мінімум кантактаў з людзьмі.

У былыя часы кліенты пры выбары ўчастка перш за ўсё кіраваліся такім крытэрыем, як адлегласць. Было важна, каб «кут» размяшчаўся недалёка ад горада. Лецішча разглядалася як дом выхаднога дня. Але стаўленне беларусаў да гэтага пытання мяняецца. Людзі пачынаюць разглядаць дачу або загарадны дом не толькі як месца адпачынку ў выхадныя дні, але і як месца правядзення сезоннага адпачынку.

Дача стала месцам, дзе ёсць асабістая прастора па абодва бакі ўваходных дзвярэй. Там прасцей перажыць ізаляцыю. Лягчэй трымаць дыстанцыю ў два метры, ды і ў дваццаць пры жаданні не складаней.

Пад Віцебскам, у краі азёр, яшчэ можна знайсці адносна недарагія пасутачныя дачы. Зусім сціплыя бунгала будуць каштаваць ад 5 да 10 рублёў у суткі на чалавека. На Браслаўскіх азёрах звычайныя дачныя домікі прапануюцца ўжо за 15—17 рублёў у суткі. Там жа, але каля возера з лодкай для рыбалкі, з лазняй, саўнай, з дзіцячай пляцоўкай арэнда будзе ацэньвацца з разліку 20 рублёў на чалавека ў суткі.

Ёсць тут, праўда, і шыкоўныя дамы на берагах азёр — па 120 рублёў у суткі. Але даражэй за ўсё будуць дамы ў скандынаўскім стылі з вялізнымі вокнамі, якія выходзяць на Мінскае мора, за 8500 рублёў у месяц. Здзівілі і некаторыя дачы за 40 кіламетраў ад Мінска: выглядаюць нармальна, але не цудоўна, а арэнда каштуе 700—900 рублёў у месяц. Многія з катэджаў, якія знаходзяцца пад Мінскам, выглядаюць шыкоўна, як і іх кошт. Попыт нараджае прапанову: раней яны не здаваліся.

## Амаль або зусім бясплатна

Адзначым яшчэ адзін значны фактар — гэта транспартныя зносіны паміж домам і дачай. Калі ў вас няма асабістага аўтамабіля, а ў абранае месца трэба дабірацца амаль гадзіну на электрычцы і яшчэ трохі на перапоўненым аўтобусе...

Дарэчы, менавіта з прычыны падобных нязручнасцяў асобныя ўласнікі прапануюць вельмі апетытныя ўмовы арэнды. Напрыклад, каля Капыля ёсць наогул бясплатнае асобнае жыллё, якое прапануюць за дагляд і сімвалічныя грошы (10 рублёў у месяц). У аб'яве так і гаворыцца: «Здам доўгатэрмінова дом у невялікай вёсцы (90 кіламетраў ад Мінска). Пажадана пара ці мужчына, у якога рукі растуць з правільнага месца. Дом просты, вясковы, без выгод. Сад, агарод, возера, лес — усё ёсць. Проста месца дзікае — крама ў суседняй вёсцы».

## Дачамі цікавяцца практычна ўсе

— Традыцыйна вясной мы назіраем павышаны попыт у сегменце загараднай нерухомасці, — кажа **аналітык партала realt.by Арцём САХАРЭВІЧ.** — Гэта адлюстроўвае статыстыка наведванняў адпаведнага раздзела на партале. Сёлета ў красавіку наведвальнасць раздзела вырасла амаль удвая супраць звычайнага — рэкордны вынік за ўсю гісторыю. Гэта значыць, на рынку павышаная актыўнасць. На думку спецыяліста, людзі звяртаюць увагу на невялікія ўчасткі, дзе можна было б перасядзець вірусны крызіс. Пакупнік прад'яўляе менш патрабаванняў да якасці хаткі — важнейшы сам факт яе наяўнасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**ЛОТ № 1:**
- Капитальное строение, инв. № 400/С-17193 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – главный производственный корпус), площадью 29971,7 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, состоящее из: капитальное строение, инв. № 400/D-152212 (назначение – производственное помещение, наименование – главный производственный корпус), площадью 29418,5 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-2, и капитальное строение, инв. № 400/D-123114 (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения), площадью 523,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-1; капитальное строение, инв. № 400/С-69015 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – автоматическая насосная станция пожаротушения), площадью 160,5 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/2; капитальное строение, инв. № 400/С-69014 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – КПП-120), площадью 19,6 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/1; капитальное строение, инв. № 400/С-97344 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 7950,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, благоустройство территории для обслуживания зданий и сооружений главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-86338 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – резервуар для хранения 8 % раствора пенообразователя), объемом 250,0 куб. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-58965 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 1000 куб. м), объемом 1000 куб. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-89988 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – площадка под емкости), площадью застройки 119,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г; капитальное строение, инв. № 400/С-85888 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 586,05 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-97346 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 325,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-89982 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1940,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-97338 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1189,75 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-89983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная напорная канализация), протяженностью 243,80 м., г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-55845 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внеплощадочная кабельная линия, напряжением 10 кВ), протяженностью 1018 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; Капитальное строение, инв. № 400/С-74384 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – внутриплощадочная телефонная канализация), протяженностью 193,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-121799 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 206,65 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, водопроводная сеть от врезки до КНС, здания насосной станции и производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-74876 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 227,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-74877 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 991,36 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-97384 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 420,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения зданий и сооружений главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-97380 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 353,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-97392 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ), протяженностью 473,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10 кВ до ТП-1, от ТП-1 до ТП-2; капитальное строение, инв. № 400/С-55838 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная напорная канализация), протяженностью 277,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-55842 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный производственный водопровод), протяженностью 1305,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-85887 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – мостовое сооружение), протяженностью 48,00 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; Внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ марки ААБл3*95, протяженностью 155 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; внутриплощадочная кабельная линия 0,4 кВ марки АВБбШв, протяженностью 70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; пункты и шкафы распределительные – 68 единиц; камера КСО-272- 5 единиц; трансформаторная подстанция – 3 единицы; панель ЩО-7024; трансформатор масляный – 6 единиц; трансформаторные ячейки КРУ-821-00848 – 2 единицы; вентилятор центробежный – 7 единиц; камера орошения – 7 единиц; кондиционер – 6 единиц; бункер пылеулавливающий – 8 единиц; дизель-генератор ДГА-3-48; туя – 3 единицы; липа – 4 единицы

Лот № 1 расположен на земельных участках: кадастровый номер 440100000002000562, площадью 4,8205 га (назначение – обслуживание зданий и сооружений главного производственного корпуса) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г; кадастровый номер 440100000002006864, площадью 0,0078 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; кадастровый номер 440100000002006865, площадью 0,0016 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; кадастровый номер 440100000002006866, площадью 0,0014 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; кадастровый номер 440100000002006867, площадью 0,0073 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121

Начальная цена продажи – 5 074 252,67 р. (пять миллионов семьдесят четыре тысячи двести пятьдесят два рубля шестьдесят семь копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 253 712 руб. (двести пятьдесят три тысячи семьсот двенадцать рублей)

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1 % от конечной цены продажи объекта. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

**Продавец – РУПП «Гродנотекстиль»,**
**230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64**

**Организатор торгов –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,**
**г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Номер р/с для перечисления задатка – р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 10 июня 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 07.03.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 08 июня 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/**



**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 401/D-15049 (назначение – торговое помещение, наименование – универмаг), общей площадью 1828,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Клубная, д. 1, кв. 2

Лот № 1 расположен на земельном участке (кадастровый № 422050400001000657), площадью 0,2162 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания универмага), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Клубная, д. 1

Начальная цена продажи – 395 520 руб. (триста девяносто пять тысяч пятьсот двадцать рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 39 552 руб. (тридцать девять тысяч пятьсот пятьдесят два рубля)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

**Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Гродненский филиал),**
**230003, г. Гродно, ул. Озерское Шоссе, 41, тел. 39-29-90**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 12 июня 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.04.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 10 июня 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**



**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

ЛОТ № 1: капитальное строение с инвентарным номером 400/С-28239 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 75,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, д. Каменная Русота

Лот № 1 расположен на земельном участке (кадастровый № 422088003601000007), площадью 0,0619 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Путришковский с/с, д. Каменная Русота. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохраной зоне водного объекта вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,0619 га

Начальная цена продажи – 15 000 руб. (пятнадцать тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 1 500 руб. (одна тысяча пятьсот рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

**Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Гродненский филиал),**
**230003, г. Гродно, ул. Озерское Шоссе, 41, тел. 39-29-90**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 30 июня 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 26 июня 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**



**Открытое акционерное общество**
**«Дорожно-строительный трест № 3» –**
**продавец (организатор аукциона)**
**15 июня 2020 года в 12.00**
**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Сведения о предмете аукциона | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Дробильная установка УДС-400, инв. № 2019** | 4 000,00 | ДСУ № 16, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156 | 400,00 |
| **Дробильно-сортировочный узел, инв. № 2020** | 6 900,00 | | 690,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **15 июня 2020 в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. *Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121194101193300000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.*
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: **212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 12.06.2020 г.; время: 17.00.**
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».



**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «Трест Белстромремонт» в форме открытого аукциона**

| № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 % | № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196391 (здание специализированное для обработки древесины и производства иделий из дерева, включая мебель) | 32 340,00 | 3 | капитальное строение с инв. № 350/С-196429 (здание административно-хозяйственное | 312 000,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196394 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 74 400,00 | 4 | капитальное строение с инв. № 350/С-196393 (сооружение специализированное складов, хранилищ) | 18 180,00 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся пятые повторные торги. **Цена на предмет торгов снижена на 50 %.** Публикация об аукционе ранее размещалась в газете «Звязда» № 183 (29050) от 26.09.2019; № 131 от 16.07.2019; № 97 от 28.05.2019; № 229 от 28.11.2018; в газете «Белорусская Нива (Сельская газета)» от 04.10.2018 г. Лоты 1–4 расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000003003302, расположенном по адресу: г. Гомель, ул. Пригородная, 31, площадь 1,8006 га с целевым назначением – для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений. Участок предоставлен на праве постоянного пользования

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **19 июня 2020 года в 14.00 (регистрация с 13.30 до 13.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, офис 1121 |
| **Шаг аукциона** | 5 % от начальной стоимости предмета торгов |
| **Задаток** | 10 % от начальной стоимости предмета торгов |

Контактное лицо для ознакомления с имуществом: +375291243853, Виталий.
Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121.
Контактное лицо для подачи заявлений +375293082897, Анаида.
**Начало приема заявлений в 10.00 08.06.2020. Окончание приема заявлений в 18.00 18.06.2020.**

| | |
|---|---|
| **Условия для участия в торгах** | 1. До подачи заявления внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000,** код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по продаже имущества ОАО «Трест Белстромремонт», назначенных на __.__.2020, по лоту №__. 2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://orgtorg.by/info/ 3. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях после возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету) в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. 4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона. 5. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества возлагаются на Победителя аукциона |
| **Информация о продавце** | **Открытое акционерное общество «Трест Белстромремонт» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122, +375 29 304 59 90)** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Фрондера» ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by** |

# Кулямётчык і мінамётчык

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як і Павел, Віктар пачынаў сваю вайну на тэрыторыі Беларусі. Абодва — пехацінцы, кулямётчык і мінамётчык. Рубіс выглядаў малым, недарослым, насіў боты дзіцячага 39-га памеру, гімнасцёркі — сорак васьмога. Віктар, наадварот, выглядаў высокім, але вельмі хударлявым.

— Мой памер абутку — сорак трэці, а адзення... якія выдавалі, — уздыхаў Вятошкін. — Форму мы заўсёды самі падганялі. А яшчэ на вайне мне заўсёды хацелася есці і спаць. Я зайздросціў танкістам — яны ехалі, а мы ўсё ішлі ды ішлі.

Са сваім 82-міліметровым мінамётам Віктар пракрочыў усю Беларусь, пачынаючы з быхаўскіх вышынь, дайшоў да Мінска, потым вызваляў Латвію і Літву, Польшу, дабраўся да нямецкай Эльбы.

— Часта не ведаў, дзе знаходзіцца часць: стралялі то спераду, то ззаду. Калі стаў сяржантам, пачаў разумець вайну... Кожная атака пачыналася гучным заклікам: «Уперад, за Сталіна, за Радзіму!» — згадваў франтавік. — Было шмат злосці, асабліва калі ішоў у атаку. Мандражкі перад боем амаль не было.

Павел Іванавіч Рубіс быў нешматслоўны, размова перапынялася, не клеілася. Напэўна, ён не мог прыгожа апавядаць, а магчыма, і не хацеў дзяліцца балючымі ўспамінамі — паспрабуй перадаць на словах перажыванні! Казаў, што пачаў запісваць свае франтавыя ўспаміны ў дзённік — знайшоў лягчэйшую форму спавядання. Затое Павел быў добрым гармоністам, ведаў традыцыйныя найгрышы, любіў душэўныя песні пра вайну. Але на фронце ў яго гармоніка з сабою не было, бо нёс цяжкі станкавы кулямёт, паліваў з яго фрыцаў злева направа — такая была ў яго смертаносная праца.

— І на вайне пелі песні — у пераходах, на прывалах, у зямлянках, — узгадваў Павел Рубіс. — Песні нас ратавалі, лячылі нашу псіхіку: мы адыходзілі ад бою, забывалі, як забівалі ворага, хавалі сваіх аднапалчан, цярпелі боль і раненні.

А наконт узнагарод і Рубіс, і Вятошкін казалі: «Вялікага ўзрушэння не адчувалі — ордэн Славы лічыўся як медаль, не быў чымсьці выключным».

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

## Павел РУБІС

Ён нарадзіўся ў лютым 1923 года на поўначы Беларусі — у вёсцы Мікуленкі Расонскага раёна. Сям'я жыла небагата. Таму, скончыўшы сямігодку, Павел Іванавіч не пайшоў далей грызці граніт навукі, а пачаў працаваць у мясцовым калгасе. Там яго і заспеў пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

Што такое мясціны на стыку Беларусі, Расіі і Латвіі? Часцей за ўсё — велізарныя лясы з нячастымі паселішчамі. Але для немцаў гэты напрамак быў стратэгічна вельмі важны. З латвійскіх партоў, якія яшчэ з царскіх часоў былі «заточаны» пад перавалку вялікай колькасці грузаў, гэта быў найкарацейшы шлях для немцаў праз Вялікія Лукі да Ржэва і далей да Масквы. Вось таму і дзейнічала на самай поўначы Беларусі і ў памежных раёнах Калінінскай вобласці Расонская партызанская брыгада. У 1942 годзе туды і сышоў Павел Рубіс.

Брыгада злучылася з часцямі Чырвонай Арміі ў пачатку лістапада 1943 года, а 20-гадовы партызан Павел Рубіс неўзабаве быў прызваны ў войска. Першы ўчынак, адзначаны ордэнам Славы III ступені, ён здзейсніў, яшчэ знаходзячыся ў статусе курсанта вучэбнай роты 156-й стралковай дывізіі, якая ваявала на 1-м Прыбалтыйскім фронце. 26 снежня баі ішлі за вёску Філіпенкі, якая знаходзілася ў Гарадоцкім раёне. Ад прыцэльнага агню нашага героя паляглі больш за дзясятак гітлераўцаў.

А вось да наступнай узнагароды прайшоў амаль год. У верасні 1944-га немцы вельмі моцна супраціўляліся пры наступленні савецкіх войскаў у Латвіі. Крыху пазней сфарміруецца «Курляндскі кацёл», баі ў якім будуць ісці яшчэ некалькі месяцаў пасля капітуляцыі Германіі. А пакуль што гітлераўцы імкнуліся адбіць назад буйны транспартны вузел Елгаву. Баі за яго ішлі настолькі жорсткія, што ў пасляваенны час гэты горад фактычна будавалі з нуля. Аднавіць удалося толькі некалькі гістарычных будынкаў. Блізу Елгавы падраздзяленні Чырвонай Арміі фарсіравалі раку Ліелупе. Варожыя кулямётныя разлікі ўскладнялі пераправу. Камандзір разліку кулямётнай роты 417-га стралковага палка Павел Рубіс, у сваю чаргу, прыкрываў агнём нашых салдат і падчас бою прымусіў назаўжды змоўкнуць два нямецкія агнявыя пункты.

43-я армія, у складзе якой дзейнічаў 417-ы стралковы полк, пасля была перакінута на ўзяцце Мемеля (цяперашняй Клайпеды) — буйнога марскога порта. 13 студзеня баі разгарэліся паблізу адной з чыгуначных платформ непадалёк ад горада. Кулямётчык Павел Рубіс праявіў там сябе найлепшым чынам — скасіў агнём 130 гітлераўцаў і вывеў са строю станкавы кулямёт разам з разлікам. Падчас вядзення бою непадалёк ад Паўла Рубіса выбухнуў артылерыйскі снарад. Герой нашага аповеду атрымаў кантузію, але поле бою не пакінуў. Атакі немцаў ён адбіваў ажно да таго моманту, пакуль не падаспела падмацаванне. 29 чэрвеня 1945 года Павел Рубіс стаў поўным кавалерам ордэна Славы.

Ён даслужыўся да звання старшыны, але надалей звязваць свой лёс з войскам не захацеў, у 24 гады дэмабілізаваўся і вярнуўся на сваю радзіму, на Расоншчыну. Скончыў Полацкае вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі і пасля ўладкаваўся на работу ў Расонскі лясгас. Там і працаваў трактарыстам. Памёр у красавіку 1996 года.



## Віктар ВЯТОШКІН

Ён нарадзіўся 10 мая 1925 года ў вёсцы Новая Мільча Гомельскага раёна. Цяпер яе не знайсці на карце Беларусі — у 1980-я гады паселішча паглынуў Гомель. Дзяцінства Віктара Дзмітрыевіча прайшло побач з чыгункай — на стальной магістралі працаваў яго бацька. Да вайны хлопец паспеў скончыць дзевяць класаў і ўжо задумваўся наконт будучай прафесіі, але настала 22 чэрвеня 1941-га...

Шаснаццацігадовы падлетак актыўна ўключыўся ў падрыхтоўку да абароны Гомеля. Ён дапамагаў капаць супрацьтанкавыя рвы. Але калі Гомель у жніўні 1941-га захапілі немцы, юнак быў вымушаны ўсё ж застацца на доўгія два гады пад акупацыяй. За некалькі месяцаў да вызвалення горада яго схапілі гітлераўцы падчас аблавы на вёску, каб адправіць на прымусовыя работы ў Германію. Але ён здолеў уцячы з-пад аховы і хаваўся ў адной з навакольных вёсак. Як толькі Чырвоная Армія вызваліла Гомель, выйшаў са свайго схову.

Тым часам у абласным цэнтры аднавіў работу чыгуначны тэхнікум, і менавіта туды і паступіў на вучобу Віктар Дзмітрыевіч. Ён аўтаматычна атрымаў бронь. Здавалася б, вайна для яго скончана, але... 18-гадовы юнак у адзін з лютаўскіх дзён 1944-га прыходзіць дабраахвотнікам у Гомельскі райваенкамат і просіць накіраваць яго на фронт. Туды ён і трапіў пасля месяца падрыхтоўкі ў запасным стралковым палку блізу горада Старадуб, які месціцца на тэрыторыі Бранскай вобласці. Хлопцу давялося змяніць некалькі вайсковых спецыяльнасцяў, але ўрэшце ён стаў наводчыкам мінамёта. Ваяваў у складзе 82-й стралковай дывізіі, якая падчас аперацыі «Баграціён» вызваляла беларускую зямлю.

Ордэн Славы III ступені Віктар Вятошкін атрымаў узімку 1945-га. У сярэдзіне студзеня пачалася Вісла-Одэрская стратэгічная аперацыя, мэтай якой быў выхад на подступы да Берліна. Але спярша трэба было прарваць нямецкую абарону на заходнім беразе Віслы. Гэтая мэта ставілася ў тым ліку перад 61-й арміяй, якая брала ўдзел у Варшаўска-Познанскай наступальнай аперацыі. Віктар Вятошкін падчас баёў блізу горада Варка падавіў два нямецкія кулямётныя пункты і прыцэльным агнём знішчыў больш за дзясятак гітлераўцаў.

За час баёў на фронце Віктар Вятошкін паказаў сябе як вельмі дасведчаны баец. Гэта дало падставы для таго, каб павысіць яго да камандзіра мінамётнага разліку. Там жа, у Польшчы, герой нашага аповеду ўпершыню прымераў лычкі малодшага сяржанта.

...У канцы сакавіка 1945-га камандаванне паставіла задачу знішчыць варожы плацдарм на ўсходнім баку Одэра на тэрыторыі сучаснага Заходнепаморскага ваяводства Польшчы. Разлік пад кіраўніцтвам малодшага сяржанта Вятошкіна знішчыў два агнявыя пункты немцаў і каля дзясятка варожых салдат і афіцэраў. Гэта паспрыяла таму, каб пазбавіцца ад пагрозы з боку плацдарма. А Віктар Дзмітрыевіч быў прадстаўлены да ордэна Славы II ступені.

У пачатку мая, калі Трэці рэйх існаваў апошнія дні, Чырвоная Армія імкнулася выйсці да Эльбы, каб сустрэцца там з саюзнікамі. Баі палка, у якім служыў герой нашага аповеду, ішлі ў Саксоніі. Разлік пад камандаваннем сяржанта Вятошкіна ліквідаваў пяць варожых агнявых пунктаў. Літаральна праз дзень 19-гадовы юнак вёў агонь з мінамёта, пры гэтым падстрэліўшы з аўтамата каля дзясятка ворагаў. Ды і свой дваццаты дзень нараджэння, які прыйшоўся на наступныя суткі пасля Перамогі, ён сустрэў у баях з часцямі СС, якія не жадалі капітуляваць.

Віктар Вятошкін быў прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Славы I ступені ў 1946 годзе. Але... так склалася, што ўзнагарода да салдата своечасова не дайшла. Амаль чвэрць стагоддзя заняў яе шлях. Уручэнне ж адбылося дзякуючы пісьменніку Яўгену Вертлібу. Працуючы ў ваенным архіве ў пачатку 1970-х гадоў, ён знайшоў звесткі пра тое, што Віктар Вятошкін быў прадстаўлены да гэтай высокай узнагароды, аднак чамусьці яе не атрымаў. Хіба была неадкладна выпраўлена.

Віктар Вятошкін стаў адным з вайскоўцаў, якія распісаліся на рэйхстагу. Ён пакінуў надпіс «Гомель. Вятошкін. Мільча». Свой працоўны шлях ён звязаў з фабрыкай «Палесдрук», дзе працаваў ажно да самай пенсіі. Яго працоўныя заслугі ацанілі высока — ордэнам Леніна і званнем «Заслужаны работнік прамысловасці БССР». Пасля выхаду на заслужаны адпачынак Віктар Вятошкін спачатку жыў у Гомелі, але пасля складанай аперацыі ў 2010-м перабраўся да сваёй дачкі ў сталіцу. У Мінску ён пражыў пяць гадоў. Пахаваны на сваёй радзіме, на могілках былой вёскі Новая Мільча.



**Валяр'ян ШКЛЕННІК. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

Выпрабавана на сабе

# ЯК Я КІНУЎ КУРЫЦЬ

**Карэспандэнт «Звязды» напярэдадні Сусветнага дня без тытуню паспрабаваў кінуць курыць, маючы стаж каля 30 гадоў. Эксперымент быў праведзены год таму. І што вы думаеце? Трымаюся ўжо год! Чаму ўрэшце захацеў жыць без тытуню, ці выкурыў хоць адну цыгарку, колькі каштуе медыцынская дапамога і ці праўда, што без нікаціну таўсцеюць? Усё пра гэта і не толькі — у нататках былога курыльшчыка.**

### З піянерскага ўзросту

Курыць паспрабаваў яшчэ ў школе — калі не памыляюся, класе ў сёмым. Нехта з аднакласнікаў скраў цыгарэты ў таты, на перапынку прапанаваў мне паспрабаваць. Першая зацяжка ледзь не збіла з ног — слёзы з вачэй. Але ж мы будучыя мужчыны, нам трэба! Так, напэўна, разважалі тады. Як толькі мама і суседзі ў камунальнай кватэры, дзе я жыў, не адчулі, што малы неяк па-даросламу пахне? У восьмым класе перыядычна курыў не толькі за кампанію з аднакласнікамі. Дзе браў? Зноў жа нехта частаваў з равеснікаў, а часцей прадаваў.

Калі вучыўся ў тэхнікуме, курыў ужо параўнальна шмат: штук па пяць-шэсць у дзень. Выкладчык ганяў нас і спрабаваў запомніць твары, каб дакласці дырэктару.

У арміі курыў нядоўга, бо вельмі цяжка даваліся фізічныя нагрузкі. Ды і сяржант, дай яму неба доўгага жыцця, мне забараніў. Маўляў: «Пукшанскі калі яшчэ пакурыць, дык падчас марш-кідка яго давядзецца цягнуць на сабе!»

Калі я працаваў у шматтыражках, асабліва не захапляўся курэннем. Канчаткова «падсеў» у абласной газеце. Там многія курылі і клікалі за кампанію. А вось у «Звяздзе» на момант майго працаўладкавання (у 2002 годзе) курылі ўсяго некалькі чалавек. Гэта мяне здзівіла, бо шмат маіх калег у Віцебску, у тым ліку і жанчыны, дымілі як паравозы. Між іншым, яшчэ больш здзівіла адна з кіраўніц «Звязды», якая кінула. Сказала, што дапамагло змяншэнне колькасці штук у дзень і ледзянцы. Я паспрабаваў і... дарэмна грошы на цукеркі патраціў.

### Ну, канешне, дзеля...

Не раз, як усе заядлыя курыльшчыкі, я спрабаваў кінуць. Дзеля жарту, каб напісаць артыкул у газету, у рэдакцыі якой працаваў даўно, дарэчы, таксама напярэдадні Дня без тытуню, правёў некалькі гадзін з абаяльнай брунеткай, каб утрымацца ад курэння. Пасля спаткання на першай жа хвіліне я дастаў з кішэні аксесуары, якія ведаюць усе курыльшчыкі.

Сыны, калі былі зусім маленькія прасілі «завязаць», бо адзенне і валасы пахнуць! Ды і які прыклад малым? Але ну ніяк не атрымлівалася адмовіцца. Ды і, шчыра кажучы, мне падабаўся працэс курэння. І зараз, калі б не прынцып, пакурыў бы... Асабліва «смачна», калі пішаш па рабоце. Зацягваешся — і быццам самі пішуцца чытэльныя тэксты, як кажуць прафесіяналы.

У красавіку мінулага года адбылося тое, што паўплывала на мяне моцна. Таму і вырашыў «завязаць». Ва ўсім, канешне, трэба шукаць жанчыну.

Дык вось яна па-жаночы хітра ўпэўніла мяне, што мне трэба кінуць курыць...

Вырашыў, што ўсё: трэба нешта рабіць, тым больш што адчуваў праблемы: задышку, калі праходзіў пару кіламетраў; бяссонніцу, калі не было чаго курыць. Літаральна страчваў настрой, калі па рабоце недзе нельга было на вуліцу выйсці праз гадзіну, каб пакурыць.

Спрабаваў напачатку сам хоць гадзіну вытрымаць без тытуню. Ніяк. Рабіў спробы не курыць у пакоі. Але ж чаму б і не атрымаць кайф, седзячы на канапе, калі ніхто не забараняе?

Зразумеў, што адзін не перамагу сваю звычку.

Таму звярнуўся ў дзяржаўную клініку, дзе лечаць у тым ліку і залежнасць ад тытуню. Не бясплатна, канешне. Грамадзянам Беларусі за кадзіроўку па метадзе Даўжэнкі давядзецца заплаціць 130 рублёў. Прасілі трое сутак не курыць. Для параўнання столькі ж каштуе кадзіроўка і ў сталічным камерцыйным медцэнтры, сайт якога знайшоў у інтэрнэце.

### Цалаваўся з попельніцай

Дай бог здароўя нарколагу, якая са мной мучылася. Пра такіх кажуць «чалавек таго часу». І я не пра ўзрост, хоць ён у яе вельмі паважаны, а пра вопыт. Калі яна сказала, што ёй за 70, я зразумеў, чаму Кіркораў і Галкін так пяшчотна адносяцца да Пугачовай. Зачаравала тым, што як я ні «спрабаваў» перашкаджаць ёй са мной працаваць, бо нешта мне не верылася, што кіну курыць, — яна цярпліва рабіла сваю справу.

А курыў я штодня ўжо два пачкі цыгарэт з фільтрам нізкай якасці. Дарэчы, кадзіраванне, як высветлілася, мне катэгарычна нельга рабіць. Нарколаг спрабавала ўплываць на мяне па метадзе нейралінгвістычнага праграмавання. Напрыклад, трэба было ўявіць, што пачак ператвараецца ў лінію, якая знікае за вушаком дзвярэй. Адпаведнае практыкаванне мне не давалася. Яшчэ спрабаваў замест цыгарэт класці на стол крэкеры. Медык сказала, што такім чынам кінуў курыць дальнабойшчык. І «Табэкс» (таблеткі, якія раяць курыльшчыкам, каб кінуць) купляў. Не дапамагло...

Напэўна, з боку выглядала смешна: выпіў таблетку, ем крэкер, чытаю электронную кнігу Алена Кара «Лёгкі спосаб кінуць курыць» і... куру. А ў перапынках пасля няўдалай спробы ператварыць пачак у лінію зноў жа з асалодай зацягваюся.

Урач вырашыла, што мне дапаможа так званае зняцце цягі — гэта не зусім кадзіраванне. Сеанс цягнуўся каля 30 хвілін. Усе дзеянні медыка я разумеў, толькі нібыта драмаў. Перад завяршэннем папырскала нешта ў рот — на смак быццам выкурыў адразу цыгарэт дзесяць. Доктар сказала, што месяц — гарантыя, але калі сарвуся, магу разок прыйсці на карэкцыю.

Гэты дзень мне здаўся жудасным. Курыць хацелася ўсё роўна. Але я прынцыпова не купляў цыгарэты — разумеў, што магу лёгка зноў пачаць. Ды і шкада было вялікіх грошай, патрачаных на лячэнне.

«Добра», што адзенне праз гады курэння пахла тытунём нават пасля мыцця. І прабачце за прызнанне: ледзь не цалаваўся з попельніцай. Але вытрымаў.

Праўда, на карэкціроўку давялося прыйсці. І, ужо калі шчыра, хацеў бы — пачаў бы курыць і пасля карэкціроўкі, але праявіў сілу волі. І за гэта паважаю сябе.

### Дапамажы сабе сам

Калі пра класікаў, дык многія літаратары, мастакі, акцёры курылі. Наконт жартаў у тэму ад геніяў мне бліжэйшы за ўсіх Марк Твэн. На мой погляд, шэдэўральна: «Напачатку Бог стварыў мужчыну. Потым стварыў жанчыну. Потым Богу стала шкада мужчыну, і ён стварыў яму тытунь». Уяўляю рэакцыю феміністак, таму прашу прабачэння. І адпаведна задаю пытанне: а вось чаму тады жанчыны кураць?

Яшчэ ён пісаў, што кінуць курыць вельмі проста, бо рабіў гэта шмат разоў, што не хоча ў рай, калі там табу на курэнне. Або: «Я ўзяў сабе за правіла ніколі не курыць больш за адну цыгарэту адначасова».

Смеху, канешне, мала. Бо насамрэч колькі здароўя мы выкурваем з сябе любімых, ды і які прыклад для дзяцей?

Між іншым, на кожным прыпынку грамадскага транспарту кіёскі з надпісам «Табакерка» — не найлепшая ідэя.

Якія мінусы з-за адмовы ад курэння? Стала цяжэй кантактаваць з курыльшчыкамі? Не! Знаёміцца з жанчынамі, наадварот, прасцей і лягчэй: усе ўражаны, што ў мяне ёсць сіла волі. А тыя, хто кураць, здзіўляюцца, што я не агітую кінуць. А пацалункі нейкім чынам кампенсуюць жаданне пакурыць за кампанію.

Наконт прыбаўкі вагі — кіло шэсць, напэўна, з'явілася. Але, зноў жа, патаўсцеў прыкладна гады два таму, да моманту, калі кінуў курыць. І літаральна на вачах, як мовяць у народзе, «пуза вылецела» ў выніку трохдзённага сядзення за камп'ютарам і паядання марожанага, піражных і шакаладак. Ды і цяпер, напэўна, прыйшоў час пісаць артыкул пра тое, як, кінуўшы курыць, зрабіць сабе атлетычную фігуру.

Пасля адмовы ад курэння не вельмі і «разнесла». Харчавацца б правільна ды фізічных нагрузак дадаць — і ўсё своечасова, — будзе чалавек стройны і падцягнуты.

Тым, хто курыць, не буду раіць кінуць. Ну навошта? Цыгарэты з 1 чэрвеня зноў даражэюць, усё больш жанчын (я гэта халасцякам) за здаровы спосаб жыцця. А хваробы лёгкіх, страўніка, праблемы з ціскам і іншыя — няўжо цудоўна ляжаць у бальніцы, калі на двары вясна?

А калі сур'ёзна, дык лепш разок выдаткаваць на спробу кінуць, каб потым на сэканомленыя ад набытага тытуню грошы купляць нешта неабходнае, радаваць блізкіх...

Дарэчы, скончу артыкул самай актуальнай тэмай на сённяшні дзень — каранавіруснай інфекцыі.

На хвіліну ўявіў сабе, што было б са мной, калі б я апынуўся ў рэжыме самаізаляцыі і калі курыў бы па-ранейшаму ў кватэры. Паколькі падчас ацяпляльнага сезона я заклейваю старыя дзверы балкона, бо дзьме, свежае паветра трапляе ў дом толькі праз фортку. Напэўна, як кажуць, не толькі сякера вісела б, але і мэбля. І ніякае праветрыванне дакладна не дапамагло б. І дыхаў бы я кругласутачна дымам... Карацей, усё я зрабіў правільна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Мовай лічбаў

# Развітайся з цыгарэтай!

### Амаль 30 % беларусаў — курыльшчыкі

**Ужыванне тытуню штогод становіцца прычынай смерці каля сямі мільёнаў чалавек ва ўсім свеце. Калі не прадпрымаць ніякіх мер, гэта лічба можа дасягнуць васьмі мільёнаў у год. Штогод 31 мая праводзіцца Сусветны дзень без тытуню.**

У Беларусі курыць 29,6 % насельніцтва, прычым сярод мужчын доля курцоў складае 48,2 %, сярод жанчын — 12,8 %. Сярод гараджан курыць каля 43,1 % мужчын, сярод вяскоўцаў — 53 %. Найбольшая доля актыўных курыльшчыкаў прыпадае на ўзроставую групу ад 30 да 44 гадоў — 32 %. Сярод былых курцоў шмат людзей ва ўзросце 60-69 гадоў. Такія звесткі прывяла **загадчык аддзялення Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вольга БАРТМАН.**

Ужыванне тытуню выклікае сардэчнасасудзістыя захворванні, каля 90 % выпадкаў раку лёгкіх звязана з курэннем. Негатыўна яно ўплывае і на жаночае здароўе, цяжарнасць і развіццё плода. Пасля адмовы ад курэння патрабуецца ад 1 да 1,5 года на аднаўленне функцый дыхання і звядзення да мінімуму рызыкі анкалагічных хвароб, якія выклікае курэнне.

Вольга Бартман адзначыла, што з 2002 года колькасць курыльшчыкаў у Беларусі зменшылася на 12 %, і гэта добры вынік, а ў моладзі мяняецца свядомасць і ўсё больш прадстаўнікоў новага пакалення выбіраюць здаровы спосаб жыцця.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Міхася Канстанцінавіча МІЦКЕВІЧА, сына Якуба Коласа, вучонага, доктара тэхнічных навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 18 (506)

На сцэне

# ШЭКСПІР, «ТАЎСТУНЫ Ў СПАДНІЦАХ» І ЦЭЛАЯ КАЛЕКЦЫЯ ВАГНЕРА

## Пяць спектакляў, з якімі можна правесці вечар на наступным тыдні

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі «з дрыжыкамі ў каленках» абвясціў, што з 5 чэрвеня будзе чакаць гледачоў непасрэдна ў сваёй глядзельнай зале. Новы «сезон» у афлайн-рэжыме РТБД пачне са свайго вузлавога спектакля «Бетон» Яўгена Карняга. Між тым меры самаізаляцыі ўсё яшчэ рэкамендаваныя, а тэатры па ўсім свеце ўсё яшчэ выкладваюць свае пастаноўкі, каб гледачы маглі ўбачыць іх на дамашнім экране. Мы прапануем не ўпускаць гэтых магчымасцяў і працягваць, нават седзячы дома, адкрываць для сябе іпастасі сучаснага тэатра. У чарговай падборцы, якая на наступным тыдні можа арганізаваць вам утульны вечар, знойдуцца Шэкспір (куды ж без яго), Остэрмаер, Мэт, Вагнер і сімвал рэвалюцыі.

### «Віндзарскія насмешніцы» ў тэатры «Глобус»

З Шэкспіра і пачнём. На беразе ракі Тэмзы ў Лондане ёсць такі тэатр «Глобус» — месца оўпэн-эйр спектакляў і паломніцтва турыстаў. У «Глобуса» доўгая, хоць і з перапынкамі, і займальная гісторыя. Ён пабудаваны на сродкі групы акцёраў, сярод якіх быў і наш ужо класік Уільям Шэкспір — драматург з'яўляўся адным з акцыянераў тэатра, а таксама яго пастаянным аўтарам, то-бок у «Глобусе» адбываліся прэм'еры адмыслова для яго створаных шэкспіраўскіх твораў. Праз нейкі час драўляны будынак згарэў, потым яго ўзнавілі, але хутка «Глобус» закрылі пурытане і ўрэшце ён быў зруйнаваны. Гэта адбылося ў 1644 годзе. Толькі ў 1989-м былі знойдзены рэшткі шэкспіраўскага тэатра, і «Глобус» вырашылі ўзвесці наноў. З ярусамі сядзячых месцаў, дваром для «стаячых» білетаў і адкрытай планіроўкай — таму спектаклі тут іграюцца толькі ў цёплую пару года. Дык вось у час кавіда «Глобус» мае цэлую праграму анлайн-паказаў сваіх пастановак — запісы выкладваюцца на YouTube-канал і даступныя гледачу цягам, напрыклад, двух тыдняў. Пакуль што можна паглядзець «Макбета» і «Зімнюю казку», а з 1 чэрвеня ў доступе акажацца свежая камедыя «Віндзарскія насмешніцы», пасля яе — «Сон у летнюю ноч». Варта дадаць, што ўсё гэта — не проста класічны Шэкспір, а сучасныя вынаходлівыя спектаклі з гумарам і актуальнымі павевамі.


«Віндзарскія насмешніцы» ў «Глобусе».

### «Таўстуны ў спадніцах» у тэатры «Шаўбюнэ»

Ад лонданскай выдатнасці да берлінскай — «Шаўбюнэ» з'яўляецца адным з найвядомейшых нямецкіх тэатраў і славіцца актуальным рэпертуарам і высакакласнай рэжысурай. Хоць бы вось работамі Томаса Остэрмаера — мастацкага кіраўніка тэатра з 2009 года і славутага сёння актуалізатара класічных твораў. Будынак, у якім знаходзіцца «Шаўбюнэ», некалі з'яўляўся першым урбаністычным комплексам Берліна з кінатэатрам на 1800 месцаў, а ў 1981 годзе быў перароблены пад патрэбы тэатра, прычым так, што тут можна іграць тры спектаклі адначасова. Свае пастаноўкі, ад самага стварэння ў 1962-м, «Шаўбюнэ» паказвае амаль кожны дзень ужо з 22 сакавіка: за гэты час на сайце калектыва можна было ўбачыць каля пяцідзесяці спектакляў, у тым ліку аўтараў, што зрабілі гэты тэатр тым, чым ён ёсць сёння, — Петэра Штайна, Сашы Вальц альбо ўласна Остэрмаера. Апошняга можна паглядзець і на наступным тыдні: 2 чэрвеня, напрыклад, «Шаўбюнэ» пакажа анлайн-пастаноўку Остэрмаера «Таўстуны ў спадніцах» паводле п'есы Нікі Сільвера. Анлайн-паказ будзе суправаджацца абмеркаваннем пастаноўкі з удзелам самога рэжысёра. А на 6 чэрвеня запланавана трансляцыя другога спектакля Остэрмаера — «Прафесара Бернхардзі» паводле Артура Шніцлера. Праграма распісаная на цэлы тыдзень — знайсці яе можна на сайце тэатра, адно што не кожнае выкладзенае відэа суправаджаецца субцітрамі.

### «Пурытане» ў Метраполітан-опера

Музыка напрасткі са славутага будынка ў нью-ёркскім Манхэтэне, дзе на сценах красуюцца фрэскі Марка Шагала, а са сцэны для тысяч адначасова выконваюцца сусветныя шэдэўры. Мы ўсё пазбягалі недасяжнага Мет, таму што парада слухаць найвыбітнейшыя творы ў выкананні найвыбітнейшых музыкантаў і салістаў здавалася банальнай. Але без Метраполітан-опера нельга: сёння гэта адна з самых прэстыжных оперных пляцовак, выступленне ў Мет для спевака — усё роўна што вяршыня музычнай кар'еры. Будынак быў у свой час узведзены адмыслова для заснаванай у 1880 годзе опернай трупы. Кожны сезон, а ён працягваецца сем месяцаў, Мет паказвае 200 оперных пастановак, якія бачыць 800 тысяч чалавек. Многія з тых опер цяпер можна глядзець анлайн: праграма распісана на кожны дзень, запісы спектакляў застаюцца ў доступе на 23 гадзіны, што хоць неяк здымае нязручнасць з-за розніцы ў часе. На наступным тыдні на сайце Мет можна паслухаць оперы «Саламея» Рыхарда Штрауса, «Лулу» Альбана Берга, «Анёл-знішчальнік» Томаса Адэса, «Тоска» Джакома Пучыні, нарэшце, «Пурытане» Вінчэнца Беліні з удзелам вядомай нам Ганны Нятрэбка. Трансляцыі аб'яднаны рубрыкай Nightly Opera Streams, якая лёгка знаходзіцца на сайце трупы.

### «Валькірыя» ў Нідэрландскай нацыянальнай оперы

Раз пайшла такая песня, зойдзем у яшчэ адзін оперны тэатр, таксама вядомы і прэстыжны, але нашмат маладзейшы, — у Нідэрландскую нацыянальную оперу. Яна месціцца ў будынку ў Амстэрдаме, дзе апроч яе працуюць балетная трупа і сімфанічны аркестр, а таксама гарадскі муніцыпалітэт. Стопера — так называецца гэты комплекс — планавалася дзесяцігоддзямі, а была адкрыта толькі ў 1986 годзе, тады нацыянальная опера сюды і пераехала. Назву, дарэчы, некаторыя з'едліва расшыфроўваюць як заклік спыніць оперу (stop opera). Але будынак — гэта адно, сама ж оперная трупа была створана пасля Другой сусветнай вайны, і сёння яна супрацоўнічае з Ла Скала і Мет, запрашае вядучых артыстаў, мае высакакласны, асабліва нахвалены хор і ўвогуле з'яўляецца адной з найпрэстыжнейшых арганізацый у сваім відзе мастацтва. Сёння на сайце Нідэрландскай нацыянальнай оперы і Нідэрландскага балета можна паглядзець адразу некалькі опер Рыхарда Вагнера: да 7 чэрвеня даступныя «Золата Рэйна», «Валькірыя», «Зігфрыд» і «Гібель багоў» — цэлая калекцыя для фанатаў нямецкага класіка.

### «Школа жонак» у тэатры «Адэон»

Гэта, напэўна, найстарэйшы з прапанаваных тэатраў у яшчэ адной сусветнай культурнай сталіцы — парыжскі неакласічны будынак, у якім сёння месціцца «Адэон», у 1782 годзе быў адкрыты каралевай Марыяй-Антуанетай, а ў 1784-м даў прэм'еру п'есы «Шалёны дзень, альбо Жаніцьба Фігаро» П'ера Бамаршэ. Напачатку тэатр меркаваўся для трупы «Камедзі Франсэз», якая раскалолася, калі краіну напаткала Рэвалюцыя, — потым ён пабыў палітычнай трыбунай, назваўся Тэатрам Роўнасці і ўрэшце стаў «Адэонам» — тым самым, дзе дэбютавала Сара Бернар, дзе ставіліся антыўрадавыя п'есы і які сёння з'яўляецца адным з трох носьбітаў звання «Тэатр Еўропы». «Адэон» можна лічыць сімвалам асветы і рэвалюцыі, прынамсі, і ў тым, і ў другім ён браў актыўны ўдзел. Падчас майскіх падзей 1968 года, напрыклад, тэатр даў прытулак бунтуючым студэнтам, за што яго кіраўнік быў звольнены. Сёння «Адэон» — гэта актуалізацыя класікі, сучасныя аўтары і гастролі замежных труп, што на парыжскай сцэне іграюць спектаклі на роднай мове. У дні кавіда на сваім сайце ён робіць «Тэатр на канапе», дзе сёння можна знайсці, у дадатак да Вагнера ў Нідэрландскай нацыянальнай оперы, яшчэ адну фанпадборку — гэтым разам Мальера. Паглядзець можна адразу тры спектаклі — «Школу жонак», «Мізантропа» і «Тарцюфа», усё ў пастаноўцы рэжысёра Стэфана Браўншвейга.

**Вольга МІЦКЕВІЧ.**

Кінакрокі

## Наша дакументалістыка — у Кракаве

**Два беларускія фільмы будуць паказаны на Кракаўскім фестывалі дакументальнага кіно, што адкрыецца заўтра, 31 мая, і пройдзе, як і іншыя фэсты ў гэтыя часы, у фармаце анлайн. Стужка Віктара Аслюка ўключана ў праграму міжнароднага конкурсу кароткага метра, а работа Андрэя Куцілы паўдзельнічае адначасова ў конкурсе кароткага метра і ў нацыянальным конкурсе.**

Паўгадзінная карціна «Эпітафія» Віктара Аслюка з'яўляецца ўдумлівым і маўклівым — у стылі рэжысёра — назіраннем за тым, што адбываецца на могілках. Тэма смерці, дарэчы, арганічна ўпісалася ў кантэкст сённяшняга жыцця.

У дваццаціхвілінным фільме «Мне трэба пацiскаў» Андрэй Куціла паказвае 92-гадовую Валянціну, якая праглядае запісныя кніжкі сваёй дачкі і «праводзіць нас у незнаёмы свет чалавека, пра якога ўсе забылі».

Трэба дадаць, што беларускія дакументалісты маюць доўгія стасункі з Кракаўскім кінафестывалем: Віктар Аслюк, напрыклад, неаднаразова ўдзельнічаў і браў узнагароды фэсту. Андрэй Куціла летась паказаў тут сваю работу Summa пра сусвет мастака Анджэя Струміла і атрымаў за яе Сярэбранага Лайконіка.

Кракаўскі фестываль дакументальнага кіно — гэтым разам юбілейны шасцідзясяты — пройдзе з 31 мая да 7 чэрвеня.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**

Агляд

# КІНО, ЯКОГА НЕ ЧАКАЛІ

## Прафесіяналы расказваюць пра самыя «драйвовыя» беларускія кінапраекты

**Што ў беларускім кіно было такога надзвычайнага, што разбурала бы стэрэатып пра сумны і нецікавы айчынны кінематограф? Што ішло ўразрэз з генеральнай лініяй і з'ўлялася нягледзячы ні на што? Што было нетыповым, перадавым, авангардным для свайго часу і нават пэўным чынам вызначала кірунак развіцця кінамастацтва? З гэтымі пытаннямі мы звярнуліся да кінапрафесіяналаў, што ведаюць айчыннае кіно як свае пяць пальцаў, каб у выніку атрымаць два фільмы, адзін серыял і адзін кінапраект, то-бок чатыры з'явы, па якіх варта даследаваць «іншае» беларускае кіно. Але гэта пакуль што: на сайце газеты падборка будзе дапаўняцца.**

### Арт-праект «ХРАНАТОП» Андрэя Кудзіненкі

**Тарас ТАРНАЛІЦКІ, кінааглядальнік:**

— Калі задацца пытаннем, што ў сучасным беларускім кіно можна аднесці да авангарду, на розум адразу прыходзяць работы Андрэя Кудзіненкі.

Фактычна апошні вучань па-сапраўднаму вялікага савецкага кінамастака Віктара Турава, ён з самага пачатку не шукаў паразумення з афіцыйнымі інстытуцыямі і аўтарытэтамі, на ходу руйнуючы ідэалагічныя каноны. Так, альманах «Акупацыя. Містэрыі» ў сярэдзіне нулявых разбурыў свяшчэнны міф пра Вялікую Айчынную як гераічны эпас, ператварыўшы яго ў постмадэрнісцкае сутыкненне жанраў, хрысціянскіх сюжэтаў і культурных архетыпаў. Тут чырвонаармеец мог аказацца злодзеем, а нямецкі салдат — ахвярай абставін, паліцай марыў пра сапраўднае беларускае кіно, а партызаны ў лесе разважалі аб нацыянальнай самаідэнтыфікацыі.



Такая эклектычная кінамова зноў паўстала праз дзесяць гадоў, у сярэдзіне 2010-х, калі Кудзіненка распачаў мастацкі арт-праект, заклiканы даць маладым аўтарам метады калектыўнай работы ва ўмовах нястачы грошай дзяржава не дапамагае, а не здымаць немагчыма. Так з'явіўся «Хранатоп» — YouTube-серыял без пачатку і канца, у якім аўтары ў кароткай форме аднаўлялі старадаўнія рытуалы беларусаў, расказвалі хтанічныя казкі пра сучаснасць, перапрыдумлялі сваю «паўднёвую готыку», дзе містыка і макабр ідуць плячо да пляча. Тым не менш праз чатыры гады класічны «Хранатоп» сканаў, не вытрымаўшы выпрабавання «меднымі трубамі»: рэжысёры перасталі публікаваць у сеціве свае работы, разлічваючы атрымаць поспех на звычайных кінафестывалях, а гэта ішло ўразрэз з ідэйнымі каштоўнасцямі праекта. На яго месцы год таму паўстаў «Хранатоп В», але які лёс яго чакае, нам яшчэ давядзецца ўбачыць.

### «УСХОДНІ КАЛІДОР» Валянціна Вінаградава («Беларусьфільм», 1966)

**Ірына ДЗЯМ'ЯНАВА, праграмны дырэктар кінафестывалю «Лістапад»:**

— Банальна казаць, што Вінаградаў з «Усходнім калідорам» апярэдзіў час, але фільм сапраўды вылучаўся і выклікаў шалёнае супраціўленне, у першую чаргу з-за тэматыкі. Карціна апавядае пра дагэтуль не прачытаную, не асэнсаваную і не даследаваную старонку гісторыі — мінскае падполле, хоць слова «мінскае» тут не прагаворваецца. Вінаградаў на гэтай глебе ствараe амаль дэтэктыўны сюжэт, дзе невядома, хто правы, хто вінаваты, хто здраднік, а хто ахвяра. Увесь фільм — клубок незразумеласцяў, дзе за эстэцкімі камерай і інтэр'ерамі тым не менш прачытваецца рэжысёрская думка, што вайна амаль у кожным забівае чалавека і абуджае звера, што ў такіх умовах у неідэальнай чалавечай натуры не можа не праявіцца жудасная істота.

Да таго ж карціна візуальна незвычайная, хоць яе візуальны бок — аператарам быў Юрый Марухін, а мастаком Яўген Ігнацьеў — нават у большай ступені ўражвае нас сённяшніх. Аўтары надзвычайна працуюць з фактурай і святлом, сыходзяць у графіку і гуляюць сілуэтамі, здымаюць у дзіўных інтэр'ерах — казематах, каменных падвалах са скляпеністымі столямі, закінутых ці то касцёлах, ці то ў цэрквах.

Важна, што Вінаградаў са сцэнарыстам Алесем Кучарам ва «Усходнім калідоры» здолелі закрануць яўрэйскую тэму. У фільме, напрыклад, гучаць чатыры мовы — беларуская, руская з утрыраваным беларускім акцэнтам, нямецкая і ідыш, чаго для тых часоў немагчыма ўявіць.

Драма ў тым, што карціна ні на што не паўплывала, бо яе ніхто не бачыў: яна паказвалася ў трэцеразрадных клубах, дзе сеанс адбываўся, калі куплялася пяць білетаў. Гэта драма і сённяшняга беларускага кіно: неабходная ў мастацтве сувязь часоў папросту адсутнічае. Святлана Алексіевіч неяк сказала пра стужку «Хатынь. 5 км» Ігара Калоўскага і Алеся Адамовіча: маўляў, каб яна выйшла тады, калі была створана, то наша дакументальнае кіно развівалася б інакш. Тое ж з «Усходнім калідорам», які хоць і не лёг на паліцу, тым не менш быў надоўга забыты.



### «УСЯ КАРАЛЕЎСКАЯ РАЦЬ» Аляксандра Гутковіча (БТ, 1971)

**Максім ЖБАНКОЎ, культуролаг:**

— У савецкім кіно Захад быў аб'ектам ідэйнай крытыкі і ціхай зайздрасці. Людзі «адтуль» выглядалі шпіёнамі, аферыстамі, бандзюкамі, здраднікамі і алкатусоўшчыкамі — у найлепшым выпадку карысталюбнымі прыдуркамі і сумнымі канфармістамі. Дзіўная чароўнасць трохсерыйнага тэлефільма паводле рамана Роберта Пэна Уорэна ў тым, што ён фармальна перадаў усе згаданыя шаблоны, але пры гэтым ператварыўся ў рэдкай сілы (нават па цяперашніх мерках) псіхадраму.



Як звычайна, Амерыка тут «ляпілася» па-беднаму — з нарэзкі кінахронікі і прыбалтыйскіх гарадкоў, але ў гэтых умоўных пейзажах дзейнічалі, любілі і паміралі магутныя і яркія характары. Часопісны хіт пазамінулага сезона («Уся каралеўская раць» выйшла ў «Новом мире» ў 1968-м, пасля — асобнай кнігай) супаў з зорнай акцёрскай зборнай, дзе не было ніводнага выпадковага імя і слабой аддачы. Падобны эфект у тую пару далі толькі «Сямнаццаць імгненняў вясны». Жжонаў, Плят, Яфрэмаў, Папанаў, Дураў, Іваноў, Лаўрова, Янкоўскі-старэйшы, Дзямідава... І, вядома ж, цудоўны Міхаіл Казакоў у сваёй найлепшай ролі цынічнага журналюгі Джэка Бёрда.

Рэжысёр Гутковіч здолеў не проста стварыць дакладную партытуру падзеі — ён у сваёй някідкай манеры (да «Раці» здымаў па Мележу, пасля — па Шамякіну) разыграў універсальную гісторыю чалавечых страсцей. І ўся маскоўская акцёрская банда прыйшла ў «Раць», каб расказаць — па сутнасці — пра сябе. Пра тых, хто быў страчаны ў грукаце вялікай палітыкі, каго кінулі каханыя і каму здрадзілі сябры, хто безнадзейна спрабуе склеіць музыку жыцця з памылак, подласцяў і пустых надзей. Таму што тут яе больш няма з чаго склеіць. Небяспечная гэта справа — гуляць у Захад.

### «МАГІЛА ЛЬВА» Валерыя Рубінчыка («Беларусьфільм», 1971)

**Людміла САЯНКОВА, кінакрытык:**

— Калі «Магіла льва» выйшла на экраны — а стужка знята па паэме Янкі Купалы «Курган», — яе ўспрынялі як фільм пра барацьбу сялянства супраць несправядлівых князёў. Але, на мой погляд,



сацыяльная тэма ў гэтым выпадку — другарадная. Галоўным тут з'яўляецца якраз тое, за што фільм у застойныя савецкія часы, калі ён быў створаны, крытыкавалі. Яго папракалі ў драбнатэмнасці: у стужцы ёсць вельмі пачуццёва расказаная меладраматычная гісторыя адносін паміж Машэкам, Любавай і князем Усяславам — і з гэтым матывам любоўнага трохкутніка ў свой час не захацелі лічыцца.

Фільм зроблены вельмі неадназначна. Любава, якая была нявестай Машэкі, раптам становіцца выбранніцай князя, і не проста становіцца выбранніцай паняволі — яе пачуцці насамрэч паварочваюцца ад Машэкі да князя. Мы бачым, як Любава робіць гэты выбар, як ён становіцца яе ўнутраным жаданнем і як дзяўчына яму супраціўляецца. Я добра помню сцэну, калі паміж Любавай і князем у яго пакоях адбываецца збліжэнне і гэтае збліжэнне паказана як цнатлівы танец. У гэтым сэнсе «Магіла льва» — вельмі тонкая, пачуццёвая, эратычная стужка.

Тут, уласна, пачынаецца стыль тады яшчэ маладога Валерыя Рубінчыка — яго ўменне ствараць атмасферу і перадаваць нюансы схаваных пачуццяў. Да таго ж рэжысёр здорава падабраў каманду. Вядомы танцоўшчык Марыс Ліепа вельмі пластычна сыграў ролю князя. Ва ўнісон яму іграе Любаву Валянціна Шэндрыкава. Цудоўны апэратар Юрый Марухін зняў фільм такім чынам, што ў ім адчуваюцца эпічнасць і быліннасць. Мастак-пастаноўшчык Яўген Ігнацьеў дасціпна выбудаваў антураж карціны, а якія там касцюмы! Любава носіць зусім не беларускія народныя строі — у яе адзенні ёсць нешта ад егіпецкіх фараонаў, эпохі мадэрну і Густава Клімта.

Карціна была незвычайнай для свайго часу, для беларускага кіно і для экранізацый — Рубінчык не проста перавёў паэму Купалы ў візуальнае ўвасабленне, а быццам пераасэнсаваў літаратурны твор і надаў яму адэкватную экранную форму, дзе ёсць і паэзія, і эпічнасць, і гісторыя кахання.

**Падрыхтавала Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# НОВЫ ПЛАН ГОЭЛРО АД... ПРАФСАЮЗАЎ



На такіх прыгажунах дастаўляюцца ў Беларусь гуманітарныя грузы.

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў транспарту і камунікацый «БелПрафТранс» Мікалай МАЦЮК.



Старшыня рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў транспарту і камунікацый Мікалай МАЦЮК і намеснік старшыні Наталля РУСАКОВІЧ.

**— Маем права сказаць, што транспартнікі цяпер, як і медыкі, на ваенным становішчы. Пагроза для іх існуе, як для ўсіх, але яны не могуць сысці на «аддаленку», узяць работу з сабой дамоў, павінны працаваць дакладна і эфектыўна.**

— Так, транспартнікі, як і медыкі, знаходзяцца на передавой. Праца кіроўцаў, машыністаў, праваднікоў, пілотаў і сцюардэс звязана з цеснымі кантактамі з людзьмі. З усімі наступствамі, якія адсюль выцякаюць. Гэта азначае, што кожнаму трэба думаць і пра тое, каб выконваць рэкамендацыі медыкаў ва ўмовах пандэміі. Яны робяць гэта з нашай дапамогай. Іншая рэч, што эпідэмічная абстаноўка значна паўплывала на аб'ёмы паслуг, якія аказваюць транспартнікі (па не залежных ад нас абставінах), але прычын для перасцярогі менш не стала.

**— Дарэчы, раскажыце, як пандэмія «падрэзала крылы» транспарту і такім чынам наўпрост уплывае на эканоміку.**

— Раней Беларуская чыгунка ў дзень перавозіла 150–200 тысяч пасажыраў, цяпер усяго 15 тысяч. Невыкананне паказчыка «грузаабарот» складае 12,1 %, «пасажыраабарот» — 48,3 %, «экспарт паслуг» — 27,6 %.

Колькасць пасажыраў, перавезеных авіякампаніяй «Белавія», да аналагічнага перыяду мінулага года не перавышае 8 %, пасажыраабарот выконваецца на 9,3 %.

На дзяржаўным прадпрыемстве «Белаэранавігацыя» адзначаецца зніжэнне аб'ёмаў работы на 70 %.

У Нацыянальным аэрапорце Мінск істотна недавыконваюцца паказчыкі «самалётавылеты» і «пасажыраабарот».

На 4,4 % знізіўся аб'ём перавозак дзяржаўнага прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн». Упалі даходы па выручцы і на дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс».

Зніжэнне асноўных тэхніка-эканамічных паказчыкаў у параўнанні з адпаведным перыядам 2019 года адзначаецца ў аблаўтатрансах. На 60 % зменшыліся даходы па пасажырскіх перавозках. Загружанасць рухомага саставу ў гадзіны пік складае 50-58 %.

Паводле аператыўнай інфармацыі, у бягучым красавіку ў параўнанні з красавіком 2019-га аб'ём выручкі ад рэалізацыі ўсіх відаў транспартных паслуг упаў на 34,2 %. Пры гэтым аб'ём работы, што выконваецца транспартнікамі на гарадскіх і прыгарадных пасажырскіх перавозках, захоўваецца на ранейшым узроўні пры істотным зніжэнні пасажырапатоку.

Вы правільна кажаце, што гэта аказвае негатыўны ўплыў на эканоміку краіны.

Да таго ж многія работнікі транспартных прадпрыемстваў знаходзяцца ў працоўных і сацыяльных адпачынках. Ёсць у галіне і выпадкі захворвання на каранавірус.

У меншай ступені эпідэміялагічная сітуацыя закранула дарожныя прадпрыемствы. Аблдарбуды, аўтадары, дарожнабудаўнічыя трэсты працягваюць працаваць у штатным рэжыме і без прастояў. Персанал у поўным аб'ёме забяспечаны сродкамі індывідуальнай аховы.

Характэрна, што два цэхі КУП «Мінскаблдарбуд», якія раней шылі спецвопратку, цяпер асвоілі і вырабляюць ахоўныя маскі. Пашыў масак асвоены і ў КУП «Віцебскаблдарбуд».

**— Не ведаю, ці ініцыявалі вы перад Федэрацыяй прафсаюзаў і ўрадам пытанне аб павелічэнні зарплаты сваім людзям на лініі (як медыцынскім, а цяпер і сацыяльным работнікам). Магчыма, прадпрыемствы знойдуць (ужо знайшлі) унутраныя рэзервы. Але, напэўна ж, у галіне нешта робіцца для таго, каб яшчэ больш эфектыўна працавала ўласная сацыяльная сфера — рабіліся сацыяльныя выплаты, калі яны прадугледжаны, дзейнічалі дамы адпачынку і свае санаторыі і гэтак далей. Што канкрэтна, Мікалай Мікалаевіч?**

— Трэба мець на ўвазе, што ў пытаннях заработнай платы і яе павышэння транспартнікаў нельга параўноўваць з медыкамі. Медыкі фінансуюцца з бюджэту, а транспартнікі, як правіла, што заробяць — тое і атрымаюць.

Ва ўмовах скарачэння аб'ёмаў работ на прадпрыемствах транспартнай галіны ў рамках нормаў заканадаўства аб працы прыняты меры, накіраваныя, у першую чаргу, на захаванне працоўных калектываў, змену рэжымаў работы з усталяваннем няпоўнай занятасці работнікаў як з ініцыятывы наймальніка, так і з ініцыятывы работніка, забеспячэнне водпускаў без захавання заработнай платы ўсім ахвотным, аб'яўленне прастою пры значным памяншэнні аб'ёмаў работы альбо іх часовай адсутнасці.

Адным з важных кірункаў дзейнасці «БелПрафТранса» ў такой сітуацыі з'яўляецца кантроль за выкананнем нормаў калектыўных дагавораў на прадпрыемствах галіны.

У цяперашні час, нягледзячы на складаную эпідэміялагічную абстаноўку, аўтатранспартныя прадпрыемствы забяспечваюць бесперабойную работу прыгараднага і гарадскога транспарту як важнага складніка нармальнага функцыянавання эканомікі і сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь.

**— Вернемся яшчэ раз да той сітуацыі, калі рэалізацыя супрацьэпідэмічных абмежавальных мерапрыемстваў пацягнула за сабой рэзкае зніжэнне пасажыраабароту на транспарце агульнага карыстання...**

— Тут справа хутчэй не ў абмежавальных мерапрыемствах, а ў заканамернай рэакцыі на сітуацыю з боку самога насельніцтва. Інакш і быць не магло. Канешне ж, гэта прывяло да значнага зніжэння выручкі ад рэалізацыі транспартных паслуг на рэгулярных гарадскіх і прыгарадных перавозках, якія ажыццяўляюцца па фіксаваных тарыфах.

Выручка ад продажу разавых білетаў на праезд у рэгулярных зносінах мае адмоўную дынаміку, у красавіку 2020 года ў параўнанні з сакавіком выручка знізілася на 45 %: на прыгарадных маршрутах — на 33 %, міжгародніх — на 46 %.

Мы адрэагавалі на сітуацыю, Беларускім прафсаюзам транспарту і камунікацый у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі былі накіраваныя прапановы па стабілізацыі абстаноўкі на прадпрыемствах галіны для накіравання іх на разгляд у Савет Міністраў.

Мы прапанавалі ўстанавіць на перыяд з 1 мая да 31 снежня 2020 года нулявую стаўку па ПДВ пры выкананні перавозак пасажыраў транспартам агульнага карыстання ў рэгулярных гарадскіх і прыгарадных зносінах; прадугледзець выдзяленне дадатковых субсідый для транспарту агульнага карыстання, які забяспечвае перавозку пасажыраў у рэгулярных гарадскіх і прыгарадных зносінах.

Важна таксама прыняць рэкамендацыі Нацыянальнага банка камерцыйным банкам і лізінгавым кампаніям аб адтэрміноўцы выплаты альбо рэструктурызацыі крэдытных або лізінгавых плацяжоў па набытых аўтамабільных транспартных сродках на тэрмін ад 6 месяцаў, прымяненне льготных працэнтных ставак па крэдытах, якія выдаюцца транспартным арганізацыям.

***Даведачна:** на сённяшні момант гэтае пытанне застаецца самым вострым, бо аб'ём выручкі знізіўся істотна, грашовыя сродкі на рахунках арганізацый адсутнічаюць і плаціць па крэдытных і лізінгавых абавязацельствах на сённяшні дзень не ўяўляецца магчымым. У гэтых умовах без прыняцця тэрміновых мер па падтрымцы галіны можна разбурыць усю транспартную сістэму ў краіне.*

**— Мікалай Мікалаевіч, ці аказваецца ў неабходных выпадках адрасная сацыяльная дапамога членам прафсаюза? Ці стваралі вы ў новых умовах спецыяльны страхавы фонд: для аказання дапамогі сваім работнікам, для пералічэння дапамогі медыцынскім работнікам?**

— У прафсаюзных арганізацыях галіны былі створаны фонды дапамогі для аказання дапамогі членам прафсаюза як у набыцці сродкаў індывідуальнай аховы, сродкаў дэзынфекцыі, так і для аказання матэрыяльнай дапамогі.

А галіновая прафсаюзная арганізацыя Беларускай чыгункі «Дарпрафсож» пайшла далей за ўсіх і прапанавала такую інавацыйную форму абароны сваіх работнікаў ад каранавіруснай інфекцыі, як страхаванне. Страхавы ўзнос за кожнага члена прафсаюза складае 28 рублёў. У выпадку захворвання на каранавірусную інфекцыю і знаходжання на стацыянарным лячэнні на працягу 1–20 дзён работніку прадугледжана выплата ў памеры 250 рублёў. Калі хворы прабудзе ў клініцы ад 20 да 30 дзён, яму будзе выплачана 400 рублёў, звыш 30 дзён — 500 рублёў. Усяго плануецца застрахаваць на выпадак хваробы 6500 членаў прафсаюза на суму больш за 190 тысяч рублёў.

Зрэшты, на кожным прадпрыемстве прафсаюзы імкнуцца аказаць пасільную матэрыяльную дапамогу сваім работнікам. У рамках «БелПрафТранса» гэтая дапамога склала больш за 300 000 рублёў. Амаль на такую ж суму прафсаюзнымі арганізацыямі набыты індывідуальныя сродкі аховы, дэзынфіцыруючыя сродкі, тэрмометры і іншае.

Дарэчы скажу, што працягваюць аздараўляць работнікаў галіны прафсаюзныя здраўніцы. З тым толькі адрозненнем, што запаўняльнасць здраўніц нашай галіны абвалілася на 60 %.

**— Пытанне, якое засталося ад мінулай нашай з вамі сустрэчы: што вырашылася з сацыяльнай пенсіяй некаторым катэгорыям работнікаў авіяцыйнай галіны (400 замест 50)?**

— Пры непасрэднай ініцыятыве «БелПрафТранса» і ФПБ падпісаны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 15 ад 17.01.2020 аб забеспячэнні дадатковых пенсійных гарантый асобным катэгорыям работнікаў, занятых на работах з асаблівымі ўмовамі працы. Да такіх работнікаў у транспартнай галіне адносяцца кіроўцы гарадскога пасажырскага транспарту і бортправаднікі, якім з 1 студзеня 2020 года замест датэрміновай прафесійнай пенсіі памерам 40 рублёў можа быць прызначана адпаведна пенсія па ўзросце за работу з асаблівымі ўмовамі працы або пенсія за выслугу гадоў у памеры каля 389—400 рублёў.

**— Клопат пра бяспеку работнікаў таксама ўваходзіць у сферу інтарэсаў прафсаюзных камітэтаў. Таму — ці наладжаны кантроль і ці аказваецца дапамога адміністрацыяй у выкананні работнікамі правіл бяспечнай работы ва ўмовах пандэміі? Ці ўсё для гэтага ёсць? І хто канкрэтна заняты такім кантролем?**

— Што датычыцца закупкі сродкаў індывідуальнай аховы (масак, аднаразовых пальчатак, спецадзення і іншага), то, як адзначалася раней, толькі прафсаюзнымі арганізацыямі на гэтыя мэты выдаткавана 210 744 рублі. Рэспубліканскі камітэт галіновага прафсаюза выступіў ініцыятарам стварэння спецыяльнага фонду дапамогі. У яго паступае 50 % сродкаў прафсаюзнага бюджэту, за кошт якіх і набываюцца дэзсродкі і сродкі індывідуальнай аховы.



Старшыня аб'яднанай галіновай прафсаюзнай арганізацыі чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў Віктар КАКОРА і генеральны дырэктар ЗАСТ «ТАСК» Ігар ВОЛКАЎ пры падпісанні дагавора аб супрацоўніцтве ў галіне абавязковага і добраахвотнага страхавання.



Чысціня — залог парадку. І здароўя.



У выніку паўсюдна на ўваходах у адміністрацыйныя будынкі і на прадпрыемствы галіны ўстаноўлены антысептычныя сродкі. Своечасова праводзіцца прыборка памяшканняў, рабочых месцаў і месцаў агульнага карыстання з прымяненнем дэзынфектара, абеззаражваюцца ручкі дзвярэй. Ажыццяўляецца комплексная прыборка і дэзынфекцыя ўсяго рухомага саставу. Зразумела, тыя, хто выконвае гэтую работу, забяспечаны спецвопраткай, ахоўнымі маскамі, акулярамі і гумовымі пальчаткамі. Адкарэкціраваны ўнутраны распарадак работы прадпрыемстваў, не дапускаецца вялікая колькасць людзей на прахадных і ў месцах прыёму ежы.

Прафсаюзы аўтатранспартных прадпрыемстваў паклапаціліся пра тое, каб у кожнага кіроўцы і кандуктара быў індывідуальны флакончык з абеззаражвальнай вадкасцю для апрацоўкі рук.

Асобна адзначу, што прынята рашэнне аб перанакіраванні сродкаў рэзервовага фонду і грашовых сродкаў па іншых артыкулах і даходах прафсаюзных арганізацый. У выпадку адмены культурных і спартыўных мерапрыемстваў сродкі на іх правядзенне адпраўляюцца ў касы ўзаемадапамогі. «БелПрафТранс» стварыў і фонд дапамогі, у які паступае 50 % сродкаў прафсаюзнага бюджэту. З яго ўжо набыты дэзсродкі на суму больш за 38 тысяч рублёў.

Для нас самае галоўнае — гэта настрой у калектывах. Цяпер паступаюць трывожныя званкі, але мы кожнаму тлумачым: сітуацыя хоць і няпростая, але кантраляваная — і людзі ставяцца з разуменнем.

У гэтых умовах мы надзвычай моцна клапоцімся пра ахову працы. Імкнёмся да так званага «нулявога траўматызму». Гэта якасна новы падыход да арганізацыі прафілактыкі траўматызму, які аб'ядноўвае тры кірункі: бяспеку, гігіену працы (здароўе) і дабрабыт работнікаў на ўсіх узроўнях вытворчасці. Мы імкнёмся матываваць да гэтага сваіх работнікаў, прыцягваем іх да вырашэння ўсіх пытанняў аховы працы. А калі з членамі калектыву раяцца, калі сумесна распрацоўваюцца рабочыя інструкцыі, ацэньваюцца рызыкі, яны актыўней імкнуцца прытрымлівацца строгіх правіл.

На транспартных прадпрыемствах узмоцнены кантроль за допускам людзей да работы. На работу прывозіць службовы транспарт.

Тэхнічныя інспектары «БелПрафТранса» перайшлі на «аддаленку» пры правядзенні маніторынгаў па выкананні заканадаўства па ахове працы. Складзены пералік пытанняў, які накіроўваецца на прадпрыемствы ў адрас кіраўніка арганізацыі і пасля запаўнення інжынерамі па ахове працы і грамадскімі інспектарамі вяртаецца ў тэхнічную інспекцыю для апрацоўкі і аналізу.

**— Наколькі напружана працуе ў гэтай абстаноўцы прававая інспекцыя?**

— Прававыя інспекцыі працы прафсаюзаў створаны для арганізацыі і ажыццяўлення грамадскага кантролю, забеспячэння прававой абароны працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў работнікаў. Прававыя інспектары ажыццяўляюць свой кантроль на планавай аснове, у формах праверак, маніторынгаў, удзелу ў рабоце калегіяльных органаў, камісій і іншых формах, прадугледжаных заканадаўствам, калектыўнымі дагаворамі (пагадненнямі).

Адзіным адрозненнем ў цяперашні час з'яўляецца толькі той факт, што пры наяўнасці неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкі на прадпрыемстве суб'екта, які правяраецца, праверка пераносіцца на больш спрыяльны перыяд.

А нашымі прававымі інспектарамі прыёмы цяпер праводзяцца з дапамогай кансультавання грамадзян па тэлефоне на рабочых месцах, а таксама шляхам падрыхтоўкі адказаў на пытанні, якія паступілі па папярэднім запісе.

**— Адно ўдакладненне, Мікалай Мікалаевіч. Ці адрозніваецца ўся гэтая работа па сваім змесце і аб'ёме ад работы на транспартных прадпрыемствах прыватнай уласнасці?**

— Адрозненняў няма. Ва ўсякім разе, іх не павінна быць. А работа па стварэнні пярвічных прафсаюзных арганізацый на прадпрыемствах прыватнай формы ўласнасці праводзіцца на пастаяннай аснове. На важнасць гэтай акалічнасці звярнуў увагу ў сваім выступленні на VIII з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.

**— Апошняе пытанне — вось такое. Яно, безумоўна, на перспектыву, але недалёкую. Кіраўнік краіны ставіць задачу больш смелага і маштабнага пераходу на электратранспарт. Хоць у вас і без таго электрыфікацыя на вышыні. Засталіся на бензіне і дызельным паліве аўтобусы, таксі, хто яшчэ? І тым не менш. З пускам БелАЭС гэты кірунак работы будзе актывізавацца...**

— Можна, вядома, зрабіць выгляд, што не наша гэта справа. Такога канкрэтнага даручэння ў нас пакуль няма. Але ж укараненнем электратранспарту ўсё роўна будзе займацца хто? Члены нашага прафсаюза. Я пакуль не раіўся з калегамі, але мы падумаем над тым, што, можа, варта ўзяць пад кантроль стварэнне і работу інжынерных груп на прадпрыемствах, інжынерных штабоў ў падгалінах. Такі ўдзел можа зрабіць гонар — бо гэта, можна сказаць, наш план ГОЭЛРО для краіны, толькі на новы лад.

Прафсаюзы цяпер актыўна ўключыліся ў палітычную кампанію, якая разгортваецца ў краіне. Створаны штаб, распрацаваны і зацверджаны план мерапрыемстваў па ўдзеле «БелПрафТранса» ў выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Актыўна праводзіцца работа па падборы і накіраванні на выбарчыя ўчасткі назіральнікаў з ліку прафсаюзных актывістаў.

Працягваюцца нашы міжнародныя кантакты — з дапамогай інфармацыйных тэхналогій, а запланаваныя мерапрыемствы будуць праводзіцца пасля паляпшэння эпідэмічнай сітуацыі.





За работай – швачка 4-га разраду Наталля МАЖАР (справа) і раскройшчык матэрыялаў 5-га разраду Алена ЦЕРАМАВА з філіяла «Рамонтна-механічны завод» ДП «Мінсктранс».



Перадача ахоўных медыцынскіх масак ад транспартнікаў установам аховы здароўя.

**Матэрыялы падрыхтавалі**
**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ**
**і з архіва прадпрыемства.**

УНП 805003367

## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «Авто от Мастеркард. Июнь»

**1. Организатор Рекламной игры**

Закрытое акционерное общество «Сэлмон-Графикс» (далее – Организатор), УНП 100843219, адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, комн. 43.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Заинтересованное лицо).

**2. Наименование и территория проведения Рекламной игры**

Рекламная игра носит название «Авто от Мастеркард. Июнь» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

**3. Срок начала и окончания Игры**

Игра проводится с 01 июня 2020 г. по 06 августа 2020 г. (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

**4. Комиссия по проведению Игры**

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

Лукашевич Ольга Леонидовна – индивидуальный предприниматель – управляющий ЗАО «Сэлмон-Графикс» – председатель комиссии;

Стельмах Александр Петрович – заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа Крама»;

Василькова Елена Александровна – ведущий специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

Садовская Диана Сергеевна – специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

Расько Екатерина Александровна – экономист по договорной работе ООО «Сэлмон Медиа».

**5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра**

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard (далее Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/ Maestro, для оплаты топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

**6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Игры**

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, являющиеся держателями действующей банковской карты Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro с учетом ограничений, указанных в данных правилах (далее – Участник Игры).

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

в период с 01 июня 2020 г. по 30 июня 2020 г. включительно совершить покупку топлива по собственной Карте Mastercard, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 1 (одного) белорусского рубля одним чеком с использованием собственной зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты (в дальнейшем – Карта Белоруснефть), которая определяет физическое лицо как участника программы лояльности клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».

Зарегистрированной считается Карта «Белоруснефть» при указании ее владельцем в анкете регистрации следующих достоверных данных: фамилии, имени, отчества (при наличии), даты рождения, номера мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, а также адреса электронной почты.

6.4. Участник Игры может участвовать в Игре только один раз независимо от количества и сумм совершенных покупок.

**7. Состав и размер призового фонда и источники его формирования**

Размер призового фонда игры составляет **32 048,05** (тридцать две тысячи сорок восемь) белорусских рублей 05 копеек. Состав призового фонда:

| Наименование | Количество, шт. | Стоимость за единицу, бел. руб. | Общая стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Автомобиль: HYUNDAI ACCENT F/L (HCr)** Год выпуска: 2020 Цвет кузова: Красный перламутр (R4R) Номер кузова: Z94K241BAMR220766 | 1 | **27 900,00** | **32 048,05** |
| И денежные средства для уплаты налога в размере **4 148,05** белорусского рубля | 1 | **4 148,05** | |

Источником формирования призового фонда Игры являются денежные средства Заинтересованного лица – ООО «Рефорте».

**8. Проведение розыгрыша призового фонда**

**8.1. Место, дата и время проведения розыгрыша**

Розыгрыш призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 143 (АЗС № 23 РУП «Белоруснефть-Минскавтозаправка»).

Дата и время проведения розыгрыша: 13 июля 2020 г. в 18.35.

**8.2. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей**

8.2.1. Для розыгрыша в установленном порядке формируется список участников (далее – Список) с указанием даты первой транзакции, соответствующей условиям Рекламной игры, присвоенного номера шанса, номера карты, фамилии, имени, отчества (при наличии) участника, даты рождения, электронного адреса, телефона, населенного пункта и области.

Каждому Участнику Игры, выполнившему условия, указанные в подпункте 6.3. данных правил, присваивается номер Шанса по номеру Карты Белоруснефть в порядке возрастания. Все номера Шансов имеют одинаковую разрядность.

8.2.2. Для проведения розыгрыша используются специальный вращающийся непрозрачный барабан и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

Определение выигрышного номера Шанса происходит путем его формирования поразрядно слева направо из номеров шаров, последовательно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера Шанса в барабан помещаются шары с номерами от «0» до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего порядкового номера Шанса из Списка. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера Шанса.

Далее для определения цифры в следующем разряде формируемого выигрышного номера Шанса в барабан загружаются шары с номерами, которые существуют в соответствующем разряде номеров Шансов в Списке. Шары перемешиваются, и из барабана извлекается один шар. Номер шара вносится в протокол и записывается в соответствующий разряд формируемого выигрышного номера Шанса.

Определение 2 (двух) альтернативных выигрышных номеров Шансов (Альтернативного победителя № 1 и Альтернативного победителя № 2) происходит следующим образом: Альтернативным победителем № 1 становится Участник Игры с номером Шанса через 6000 номеров от победившего номера Шанса, Альтернативным победителем № 2 становится Участник Игры с номером Шанса через 12 000 номеров от победившего номера Шанса.

В случае если выпавший номер Шанса находится в конце Списка, то исчисление для определения Альтернативных победителей продолжается с начала Списка.

8.2.3. При проведении розыгрыша Комиссией оформляется протокол розыгрыша.

8.2.4. Участники Игры вправе присутствовать при проведении розыгрыша.

**9. Срок и способ информирования победителя, место, порядок и срок выдачи выигрыша**

9.1. После проведения розыгрыша Организатор уведомляет победителя о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 15 июля 2020 г. включительно.

9.2. Для получения приза победителю необходимо в срок не позднее 17 июля 2020 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by следующие данные:

9.2.1. для граждан Республики Беларусь, а также иностранных граждан и лиц без гражданства, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь:

- копию страницы 25, страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;

- копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

9.2.2. для иностранных граждан и лиц без гражданства, не имеющих вида на жительство:

- копию паспорта страны, гражданином которой он является (для лиц без гражданства – документ, подтверждающий их личность, выданный в порядке законодательства страны фактического проживания). В случае если данный документ выдан не на государственном языке Республики Беларусь, также заверенный нотариально перевод такого документа на государственный язык Республики Беларусь.

9.3. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, пр-т Победителей, 143 в срок не позднее 20 июля 2020 г. включительно. Победитель предварительно согласовывает дату и время прибытия для получения приза с Организатором по телефону +375 17 216-80-77.

9.4. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с победителем любым из указанных выше способов, либо победитель не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо победитель отказывается от приза, либо победитель не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче приза Победителю в связи с нарушением правил Игры, право на приз переходит Альтернативному победителю № 1.

9.5. Альтернативный победитель № 1 уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 22 июля 2020 г. включительно. Для получения приза альтернативный победитель, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 24 июля 2020 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, пр-т Победителей, 143 в срок не позднее 27 июля 2020 г. включительно.

9.6. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с Альтернативным победителем № 1 любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 1 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо Альтернативный победитель № 1 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 1 не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче приза Альтернативному победителю № 1 в связи с нарушением правил Игры, право на приз переходит Альтернативному победителю № 2.

9.7. Альтернативный победитель № 2 уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 29 июля 2020 г. включительно. Для получения приза Альтернативный победитель № 2, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 31 июля 2020 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: igra@salmongraphics.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, Минск, пр-т Победителей, 143 в срок не позднее 06 августа 2020 г. включительно.

9.8. Альтернативный победитель № 2 утрачивает право на получение приза, если с ним не удается связаться любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 2 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Белоруснефть», либо Альтернативный победитель № 2 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 2 не явился за получением приза, либо принято решение об отказе в выдаче ему приза в связи с нарушением правил Игры.

9.9. В случае если победитель (Альтернативный победитель № 1 или № 2) не может приехать за получением приза лично, приз может получить его доверенное лицо по предъявлении копии паспорта либо вида на жительство победителя (Альтернативный победитель № 1 или № 2), своего паспорта либо вида на жительство и нотариально заверенной либо приравненной к таковой доверенности от победителя (Альтернативного победителя № 1 или № 2).

9.10. С момента передачи приза к победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или № 2) переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом. Денежная компенсация стоимости призов не производится. Победитель (соответственно – Альтернативный победитель № 1 или № 2) (в случае их нежелания получить приз) не вправе передать право на получение приза другому лицу. Приз не подлежит замене.

9.11. В соответствии с законодательством Республики Беларусь при выдаче призов Организатор удерживает и перечисляет в бюджет подоходный налог в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, из суммы денежных средств соответствующего приза. Вручение призов осуществляется за минусом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза.

9.12. Организатор не оплачивает победителю (соответственно – Альтернативному победителю № 1 или № 2) расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

**10. Порядок информирования об условиях и результатах Игры**

10.1. Факт участия в Игре означает, что Участники Игры соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фото-, аудио-, видео- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором и Заинтересованным лицом в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору, Заинтересованному лицу.

10.2. Участник Игры, претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Игры для получения приза.

10.3. Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников Игры с настоящими Правилами.

10.4. Правила проведения Игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Игры в газете «Звязда». Информация о результатах розыгрыша публикуется не позднее 04 августа 2020г. включительно в газете «Звязда».

10.5. Телефон для справок по вопросам проведения Игры (МТС – 033, A1 – 029, Life – 025) 6 431 431 круглосуточно без выходных.

*Свидетельство № 3786 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 20 мая 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*



## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ООО «Дверная мануфактура»** (УНП 691450630) в лице управляющего в деле о банкротстве частного предприятия «Гетман и Партнеры», тел. +375 (29) 674-58-10.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **30 июня 2020 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автоподатчик IMC-48 D | 984,80 |
| 2 | Ворота распашные секционные 4,0*2,1 | 184,00 |
| 3 | Контейнер металлический 6,0 х 2,45 х 2,6 м | 841,60 |
| 4 | Кромкооблицовочный станок Holz Her 1408 | 2899,20 |
| 5 | Мотокоса FS130 с косильной головкой | 292,00 |
| 6 | Пресс для облицовки шпоном JOOS | 17148,00 |
| 7 | Промышленный пылесос M450 S60 в комплекте | 2 191,20 |
| 8 | ПВЭМ N-Tech-I-X 7500/H11Ob/1 6гб/120Г6/5ООгб/1050т | 299,20 |
| 9 | Торцовочный станок GRAULE TYPE ZS 136N | 1 012,00 |
| 10 | Установка УВН-100 | 1 661,60 |
| 11 | Стеллаж грузовой сборно-разборный фронтал 1300*2700 | 2 768,80 |
| 12 | Универсальный заточный станок GRAULE TYPE ES | 2 684,80 |
| 13 | Форматно-раскроечный станок мод. Z-3200 | 6 355,20 |
| 14 | Фрезерный станок с шипорезной кареткой Т-120-ТР | 7 773,60 |
| 15 | Станок фуговально-рейсмусовый KS500 | 4 478,40 |
| 16 | Аккумуляторная дрель-шруповерт T18+3Li 5.2-Plus | 570,40 |
| 17 | Блок-контейнер БК1 114,40 | 114,40 |
| 18 | Компрессор GA 15 VSD+ 13FF | 11 166,40 |
| 19 | Контейнер металлический 5,0 х 2,45 х 2,6 м | 1 011,20 |
| 20 | Ротационная полировальная машинка POLLUX 180E | 640,80 |
| 21 | Станок узколенточный шлифовальный BAUERRICHTER BA2 | 5 468,00 |
| 22 | Фильтр магистральный UD60+ | 782,40 |
| 23 | Шаблон для кухонных столешниц APS 900/2 | 350,40 |
| 24 | Модульный кромочный фрезер MKF700 EQ/B-Plus | 438,40 |
| 25 | Ворота распашные секционные 4,0*2,1 | 184,00 |

**Местонахождение: п. 1-14 – Минский р-н, д. Шубники, д. 1,**
**п. 15-25 – Минский р-н, аг. Колодищи,**
**тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 30.05.2020 г. 09.00 по 29.06.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.



## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| |
|---|
| **ЛОТ 1:** |
| - капитальное строение, инв. № 452/С-8923 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад фуражного зерна), площадью 3047,0 кв. м, расположенное по адресу: Зельвенский р-н, Кремяницкий с/с, 4, склад фуражного зерна; - капитальное строение, инв. № 452/С-8924 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание цеха травяной муки), площадью 2161,8 кв. м, расположенное по адресу: Зельвенский р-н, Кремяницкий с/с, 4/1, здание цеха травяной муки в р-не д. Зельвянка; - капитальное строение, инв. № 452/С-9030 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание цеха по производству комбикорма), площадью 616,2 кв. м, расположенное по адресу: Зельвенский р-н, Кремяницкий с/с, 4/4, здание цеха по производству комбикорма; - капитальное строение, инв. № 452/С-9031 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административное), площадью 376,3 кв. м, расположенное по адресу: Зельвенский р-н, Кремяницкий с/с, 4/2, здание административное; - капитальное строение, инв. № 452/С-9032 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада зерна), площадью 273,1 кв. м, расположенное по адресу: Зельвенский р-н, Кремяницкий с/с, 4/3, здание склада зерна |
| ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 422683400002000012 (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения (для строительства и обслуживания зданий и сооружений (цеха травяной муки, склада фуражного зерна, цеха по производству комбикорма, здания административного)), площадью 1,8327 га по адресу: Зельвенский р-н, Кремяницкий с/с, в районе д. Зельвянка. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,1682 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги, площадь 1,2054 га |
| Начальная цена продажи – 303 526,31 руб. (триста три тысячи пятьсот двадцать шесть рублей тридцать одна копейка) с учетом НДС |
| Сумма задатка – 15 176 руб. (пятнадцать тысяч сто семьдесят шесть рублей) |
| Условия проведения аукциона – аукцион без условий |
| **Продавец – ОАО «Агрокомбинат «Скидельский» Филиал «Князево», 231942, а.г. Князево, ул. Приозерная, 1, тел./факс 8-01564-740-13** |
| **Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70** |
| Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 01 июля 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/ |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18** |
| **Последний день приема заявлений – 29 июня 2020 г. до 15.00** |

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**


# ПАСЛЯ КАРНАВАЛУ

## Што адбываецца ў Бразіліі?



**Дырэктар праграмы СААЗ па надзвычайных сітуацыях у галіне аховы здароўя Майк Раян назваў Паўднёвую Амерыку «новым эпіцэнтрам» пандэміі каранавіруса, а Бразілію «найбольш пацярпелай краінай». Пры гэтым эксперт звярнуў асаблівую ўвагу на рэгіён Амазонія, дзе шчыльнасць заражэння і смяротнасць ад COVID-19 з'яўляюцца найвышэйшымі ў краіне. Бразілія выйшла на другое месца ў свеце па колькасці заражаных, і тэмпы прыросту застаюцца надзвычай высокія. Як вядома, найбольш пацярпелыя еўрапейскія дзяржавы — Вялікабрытанію, Іспанію і Італію — лацінаамерыканская краіна абышла літаральна за тыдзень. Паводле афіцыйнай статыстыкі, паказчык зарэгістраваных выпадкаў захворвання перавысіў 400 тысяч, да якіх штодня дадаецца каля 20 тысяч новых. Як Бразілія ператварылася ў сусветны ачаг пандэміі і калі здолее выкараскацца з цяжкай сітуацыі?**

### ШПІТАЛЬ НА СТАДЫЁНЕ

Бразілія стала першай краінай у Паўднёвай Амерыцы, дзе з'явіўся COVID-19. Крыху больш чым тры месяцы таму — 26 лютага, акурат на наступны дзень пасля заканчэння сусветна вядомага карнавалу, які суправаджаўся масавымі гуляннямі па ўсёй краіне, міністр аховы здароўя краіны сабраў прэс-канферэнцыю, дзе было абвешчана пра першага хворага на каранавірус. Як і ў многіх іншых дзяржавах, так званы нулявы пацыент прывёз інфекцыю з-за мяжы, вярнуўшыся ў Сан-Паўлу з рабочай паездкі ў Італію. Сёння гэты мегаполіс, у агламерацыі якога жыве звыш 21 мільёна чалавек, стаў эпіцэнтрам распаўсюджвання каранавіруса ў найбуйнейшай дзяржаве Паўднёвай Амерыкі (па колькасці насельніцтва — 211 мільёнаў чалавек — Бразілія на шостым месцы ў свеце і на пятым — па тэрыторыі).

Паколькі Бразілія з'яўляецца федэратыўнай рэспублікай, улады штатаў маюць паўнамоцтвы ўводзіць свае каранцінныя меры. Галоўнымі асяродкамі распаўсюджвання COVID-19 сталі пяць штатаў — апроч Сан-Паўлу, гэта Рыа-дэ-Жанейра, Сеара, Пернамбуку і Амазонас. На іх прыпадае больш за 80 працэнтаў смерцяў, як вынікае з падлікаў экспертаў Універсітэцкага каледжа Лондана. «Мы прайграём бітву з вірусам — такая рэальнасць», — з горыччу заўважыў дырэктар каранавіруснага цэнтра горада Сан-Паўлу Дымас Ковас. Сістэма аховы здароўя ў найбуйнейшым мегаполісе Бразіліі працуе на мяжы сваіх магчымасцяў. У палатах інтэнсіўнай тэрапіі з-за масавага паступлення хворых COVID-19 свабодных месцаў практычна не засталося, заявіў мэр Сан-Паўлу Бруну Ковас. Гарадскія бальніцы таксама перапоўненыя.

У Рыа-дэ-Жанейра таксама адчуваецца недахоп ложкаў у рэанімацыях. Акрамя таго, буйны ачаг паўстаў у глыбіні паўднёваамерыканскага кантынента ў сталіцы штата Амазонас — горадзе Манаус, што ў басейне Амазонкі. Там падобная сітуацыя — бальніцы перапоўненыя, а памерлых даводзілася хаваць у агульных магілах. Сітуацыю пагаршае клімат: у сярэдзіне чэрвеня ў Бразіліі пачнецца зіма. Дабрачынныя арганізацыі збіраюць цёплую вопратку, медыкаменты, ежу для бяздомных, але наўрад ці гэтага хопіць на ўсіх.

Легендарны стадыён «Маракана» ў Рыа, дамашняя арэна зборнай Бразіліі, — цяпер палявы шпіталь для цяжкахворых. Гэтак сама як і былы нацыянальны стадыён «Пакаэмбу» ў Сан-Паўлу — часовыя бальніцы разгорнутыя проста на футбольных палях.

### КРЫЗІС СТАГОДДЗЯ

Сродкаў у краіны становіцца ўсё менш. Бразільскі рэал страціў больш за траціна свайго кошту да долара, стаўшы сярод валют краін, якія развіваюцца, валютай з найгоршымі паказчыкамі. З пачатку года кацiроўкі кампаній iShares MSCI Brazil знізіліся амаль на 50 працэнтаў. Паводле звестак Эканамічнай камісіі ААН для Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна, сёлета рэгіён перажыве найгоршы эканамічны спад у гісторыі. ВУП знізіцца на 5,3 працэнта.

Паводле ацэнак Міжнароднай арганізацыі працы, за мінулы месяц у выніку пандэміі 14 мільёнаў работнікаў у рэгіёне ўжо пазбавіліся рабочых месцаў.



Эксперты ўсё часцей параўноўваюць цяперашнюю сітуацыю з пасляваеннай, таму такія лідары, як старшыня ўрада Іспаніі Педра Санчас і яго мексіканскі калега Андрэс Мануэль Лопес Абрадор, папрасілі стварыць для рэгіёна свой уласны, сучасны «план Маршала». Бразілія таксама рыхтуецца да самага значнага эканамічнага крызісу ў сваёй гісторыі. Паводле ацэнак урада, ВУП знізіцца на 4,7 працэнта (у МВФ лічаць, што падзенне будзе яшчэ мацнейшае) — апошні раз падобная сітуацыя склалася ў далёкім 1901-м. А ўзровень беспрацоўя ў Бразіліі можа да канца года падняцца з бягучых 12,2 працэнта амаль да 19. Пасля фінансавага крызісу 2008—2009 гадоў урад Кітая выдзеліў вялікую колькасць сродкаў на стымуляванне эканомікі, і гэта дапамагло краінам, у якіх Кітай купляе сыравіну, напрыклад, Бразіліі, Аргенціне, Чылі. Але гэтым разам такая магчымасць наўрад ці надарыцца.

### ФАВЕЛЫ І ІНДЗЕЙЦЫ

Як заўважыў aif.ru дырэктар Навуковага інфармацыйнага цэнтра па прафілактыцы і лячэнні вірусных інфекцый Георгій Вікулаў, рэзкі скачок захваральнасці COVID-19 у Бразіліі можа быць звязаны з недаацэнкай уладамі сітуацыі, якая складвалася, і, як вынік, недастатковым узроўнем супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў. Адна з прычын хуткага распаўсюджвання каранавіруса — вялікая шчыльнасць насельніцтва ў краіне (па звестках на 2018 год яна складала 23,6 жыхара на квадратны кіламетр).

Сур'ёзную праблему ўяўляюць і гарадскія трушчобы, якія называюць фавеламі. Па інфармацыі англійскага медыцынскага часопіса The Lancet, тут жыве каля 13 мільёнаў бразільцаў. У жыхароў фавел праблемы з доступам да чыстай вады, а ў пакоі звычайна знаходзіцца не менш за трох чалавек. У такіх умовах выконваць рэкамендацыі па гігіене і сацыяльнай дыстанцыі проста немагчыма. «Многія людзі дакладна не разумеюць, што адбываецца», — расказаў кіраўнік суполкі «Райскага горада» — другой найбуйнейшай фавелы Сан-Паўлу. Паводле яго слоў, мясцовым жыхарам удалося сабраць грошы на 3 прыватныя машыны хуткай дапамогі і 8 урачоў, што цяпер змагаюцца з інфекцыяй, якая ахапіла трушчобы.

Праблемы датычацца і карэннага насельніцтва краіны — індзейцаў. Першы выпадак захворвання ў адным з бразільскіх плямён выявілі ў красавіку. Тады адзначалася, што індзейцы могуць наогул вымерці ад каранавіруса, бо ўразлівыя да завезеных у абшчыны звонку хвароб. Да сярэдзіны мая каранавірус ахапіў 38 плямён. У адным з іх ад COVID-19 памёр правадыр. Прадстаўнікі грамадскай арганізацыі «Аб'яднанне карэнных народаў Бразіліі» (APIB) заяўляюць, што ўзровень смяротнасці сярод індзейцаў у два разы вышэйшы, чым сярод астатняга насельніцтва. «Мы лечымся дамашнімі сродкамі, па рэцэптах, што перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Мы навучыліся змагацца ў адзіночку», — сказаў правадыр аднаго з плямён Андрэ Маўэ. Зразумела, што ў выпадку з каранавірусам такая схема не спрацуе.

Людзі, якія жывуць у аддаленых раёнах краіны, не маюць элементарных санітарных і медыцынскіх устаноў, а найбліжэйшыя бальніцы з аддзяленнямі інтэнсіўнай тэрапіі размешчаны на адлегласці да 1000 кіламетраў ад некаторых вёсак. Паводле статыстыкі, COVID-19 цяпер актыўна пранікае менавіта ў невялікія населеныя пункты.

### КАВАЛАК АЙСБЕРГА

Як заявіў The Financial Times бразільскі эпідэміёлаг, дырэктар Міжнароднага цэнтра даўгалецця Алешандру Калаше, улічваючы эпідэмію ў фавелах, жыхары якіх не маюць магчымасці звярнуцца па дапамогу, рэальная колькасць захварэлых і памерлых у Бразіліі можа быць значна вышэйшая. Пра гэта, дарэчы, сведчаць і вынікі даследавання Федэральнага ўніверсітэта горада Пелотас у штаце Рыў-Грандзі-ду-Сул, што на поўдні Бразіліі, якое праводзілася пры фінансавай падтрымцы міністэрства аховы здароўя. У тэсціраванні ўзяло ўдзел каля 25 тысяч чалавек з 133 муніцыпалітэтаў па ўсёй краіне.

Вынікі даследавання паказалі, што прыблізна 1,4 працэнта насельніцтва Бразіліі (каля 3 мільёнаў чалавек) могуць быць хворыя на COVID-19. «Такім чынам, паводле ацэнак даследавання, на кожны пацверджаны выпадак у гэтых гарадах існуе сем рэальных выпадкаў сярод насельніцтва, — адзначаецца ў высновах даследавання. — Пацверджаныя выпадкі, якія паказаны ў афіцыйнай статыстыцы, уяўляюць сабой толькі верхнюю частку айсберга, чыя большая частка знаходзіцца пад вадой».

У даследаванні прыводзяцца звесткі па ўсіх гарадах, дзе праводзілася тэсціраванне. Самы вялікі паказчык зафіксаваны ў невялікім горадзе Брэвес штата Пара на поўначы Бразіліі, дзе жыве крыху больш за 100 тысяч чалавек. Там каранавірус выяўлены ў 24 працэнтаў насельніцтва. А ў самым сэрцы Амазонкі — горадзе Тэфе — хворы аказаўся кожны пяты яго жыхар.

Прэзідэнт Бразіліі Жаір Балсанару назваў эпідэмію «галоўным выклікам пакалення». Пры гэтым, на яго думку, эканамічны ўрон найбольш небяспечны. З Балсанару адкрыта канфліктуюць губернатары і іншыя чыноўнікі. Па словах супрацоўніка медыцынскай школы ўніверсітэта Сан-Паўлу Дамінга Алвеса, палітычныя войны сімвалізуюць агульны падыход да барацьбы з COVID-19 у краіне. «У Бразіліі няма ніякага плана», — адзначыў The Sun вучоны.

Каранавірус стаў каталізатарам, што справакаваў рэзкую палярызацыю палітычнага жыцця краіны. Сітуацыя «абярнулася расколам унутры краіны ў момант моцнай сацыяльна-эканамічнай напружанасці», растлумачыў Кевін Іверс, віцэ-прэзідэнт кансалтынгавай кампаніі DCI Group, якая працуе з хэджавымі фондамі, што інвестуюць у краіну. Група бразільскіх вайскоўцаў у адстаўцы напісала адкрыты ліст, у якім папярэдзіла, што супрацьстаянне розных галін улады пры самым горшым развіцці падзей можа прывесці да грамадзянскай вайны.

Самі бразільцы перажываюць тое, што адбываецца, па меры сваіх фінансавых магчымасцяў і палітычных пераваг. Прычым дазволіць сабе заставацца дома могуць далёка не ўсе жыхары краіны, дзе па стане на люты ў нефармальным сектары было занята звыш 40 працэнтаў працаздольнага насельніцтва (у 11 з 27 суб'ектаў федэрацыі гэты паказчык перавысіў 50 %), а беспрацоўнымі па выніках першага квартала аказаліся 12,6 мільёна чалавек. Нездарма мэр аднаго з найбольш пацярпелых гарадоў — Манауса — Артур Ньета заўважыў, што ўвядзенне поўнага лакдаўна абернецца хаосам і бунтамі.



Эксперты чакаюць, што ў найбліжэйшы час эпідэмія толькі нарасціць абароты. Паводле прагнозу міністэрства аховы здароўя, сітуацыя з каранавірусам можа стабілізавацца да ліпеня, а памяншэнне колькасці тых, хто захварэў, адбудзецца ў верасні. Зрэшты, як усё адбудзецца насамрэч, пакажа час.

**Захар БУРАК.**




Ганна КУБАРАВА:

# «Бацькі выбралі для мяне тэніс»



## Як дачка вядомага футбаліста хацела пайсці па слядах бацькі, але стала паспяховай у іншым відзе спорту

**Ганна Кубарава пачала паказваць высокія вынікі яшчэ ў юнацкім тэнісе, у 14 гадоў яна выйграла свае першыя прызавыя, а ў 15 пачала ўдзельнічаць у дарослых турнірах. Летась дзяўчына ўпершыню ў гісторыі краіны выйграла чэмпіянат Еўропы па тэнісе — да гэтага найлепшым дасягненнем беларусаў на такім турніры было «серабро» Уладзіміра Валчкова ў 1995 годзе. Пасля перамогі на кантынентальным першынстве ў складзе зборнай Беларусі 19-гадовая Ганна стала чэмпіёнкай Еўропы яшчэ і ў камандным турніры. Пасля такіх поспехаў дзяўчыну запрасілі ў зборную краіны на паўфінальны матч Кубка Федэрацыі. Свой поспех у спорце Аня тлумачыць вялікай працай і спартыўнымі генамі. Яе тата Алег Міхайлавіч Кубараў у мінулым вядомы футбаліст, а цяпер трэнер, які працуе з латвійскай камандай «Елгава». Пра свае планы па развіцці кар'еры тэнісістка расказала ў інтэрв'ю.**

***— Ганна, раскажыце, як цяпер, ва ўмовах пандэміі, праходзяць вашы трэніроўкі.***

— Мы працягваем працаваць, праўда, перайшлі на іншы рэжым. Цяпер у нас па адной трэніроўцы ў дзень, але не так шмат тэніса, больш увагі ўдзяляем фізічнай падрыхтоўцы і тэхнічным элементам — гэта тое, на што звычайна не хапала часу раней.

***— Пандэмія моцна змяніла трэніровачны і спаборніцкі графік?***

— Так. Цяпер нам няма да чаго рыхтавацца, мы не ведаем, калі ўсё гэта скончыцца, калі зможам пачаць гуляць турніры. Кажуць, яны могуць аднавіцца ў жніўні—верасні, а магчыма, толькі налета. Але я для сябе расцэньваю гэта як магчымасць папрацаваць над памылкамі і палепшыць свой тэніс.

***— Цяпер вы выступаеце ўжо толькі ў дарослых турнірах?***

— Так, летась яшчэ магла ўдзельнічаць у маладзёжных, але гуляла ўжо толькі на чэмпіянаце Еўропы. А наогул у дарослых спаборніцтвах я з 15 гадоў, гэты пераход адбыўся ў мяне ўжо даўно. Было няпроста, бо ты выходзіш гуляць супраць вопытных дзяўчат, гэта вельмі адчуваецца, яны мацнейшыя фізічна і значна мацнейшыя ў псіхалагічным плане.

***— Сёння вашы спарынг-партнёры — гэта равеснікі або тэнісісты старэйшага ўзросту?***

— Бывае па-рознаму: трэніруемся і з Верай Лапко, на мінулым тыдні гулялі з Сашай Сасновіч. Цяпер, калі няма турніраў, усе трэніруемся ў Рэспубліканскім цэнтры тэніса, таму стараемся спаборнічаць адно з адным, гуляць таварыскія сустрэчы, каб хоць неяк разнастаіць трэніровачны працэс. Нядаўна наша федэрацыя нават арганізавала невялікі турнір, ён праходзіў без гледачоў. Такі вопыт у мяне ўпершыню, таму гэта было нязвыкла.

***— «Золата» чэмпіянату Еўропы на цяперашні момант — самая важная перамога ў вашай кар'еры?***

— Так, я паехала туды, таму што выйграла чэмпіянат краіны. Хацелася годна прадставіць



сваю дзяржаву, але ні пра якую перамогу думак не было, проста гуляла матч за матчам. Рада, што змагла выйграць тытул.

***— Пасля гэтай перамогі ў вашай кар'еры і жыцці штосьці змянілася?***

— Спачатку было шмат увагі, але пасля ўсё стала на свае месцы. 2019 год для мяне наогул склаўся паспяхова, было шмат перамог, я даходзіла да паўфіналаў 25-тысячных турніраў, выйграла свой першы 15-тысячнік.

***— Вынікам гэтых поспехаў і стаў выклік у зборную на Кубак Федэрацыі?***

— Так. Трэнеры зрабілі мне такі своеасаблівы бонус. Я ніколі не была з камандай — і вось за добрыя вынікі, каб я падцягвалася, убачыла, як гэта ўсё адбываецца на такім буйным турніры, мне зрабілі падарунак. Гэта было нечакана. Я ведала, што наўрад ці атрымаецца згуляць у Гаазе, разлічвала на тое, што змагу проста паглядзець, адчуць гэтую атмасферу, пабыць разам з камандай. Атрымала добры вопыт і зарад матывацыі да далейшай работы, для маладога гульца гэта важна.

***— Ацаніце шанцы на перамогу зборнай Беларусі ў фінале Кубка Федэрацыі.***

— У нас моцныя дзяўчаты, яны заўсёды добра гатовыя і з вялікім жаданнем выступаюць за краіну, таму шанцы добрыя.

***— Маладыя гульцы часта выбіраюць для свайго развіцця розныя замежныя тэнісныя акадэміі, вы ж засталіся трэніравацца ў Мінску...***

— Я працавала з адным польскім трэнерам, ён спрабаваў уладкавацца на работу ў Беларусі, але не атрымалася, таму нейкі час я ездзіла трэніравацца да яго ў Польшчу. Цяпер мяне ўсё задавальняе ў Беларусі, у мяне добры трэнер і па тэнісе, і па агульнай фізічнай падрыхтоўцы. Да нашых трэніровак стала далучацца таксама і Таццяна Мікалаеўна Пучак, таму мне падабаецца гэты працэс і ўсё цалкам задавальняе.

***— Спорт у вашым жыцці быў з самага дзяцінства дзякуючы кар'еры вядомага таты...***

— Так, з самага ранняга дзяцінства памятаю, што брат займаўся футболам у ФК «Мінск», а мы з мамай пастаянна прыходзілі глядзець яго трэніроўкі. Тата скончыў сваю гульнявую кар'еру, якраз калі я нарадзілася, таму я не была на яго матчах, а калі ўжо ён пачаў працаваць трэнерам — тады мы прыходзілі на гульні яго каманды. Я таксама хацела гуляць у футбол, але тата быў супраць, бацькі выбралі для мяне тэніс. Паспрабавала — мне спадабалася, зараз удзячна ім за гэта.

***— Цяпер сочыце за гульнямі бацькавых камандаў?***

— Так, калі ён працаваў у Беларусі, старалася прыходзіць на стадыён, цяпер гляджу трансляцыі. Брат таксама ўжо скончыў сваю кар'еру футбаліста, адвучыўся на трэнера ў Беларусі і Германіі і цяпер дапамагае тату ў «Елгаве».

***— Бацька ўдзельнічае ў вашым спартыўным жыцці?***

— Так, ён мне вельмі дапамагае, пастаянна камунікуе з трэнерамі. У маім выпадку тата ў спорце — гэта плюс, таму што ён сам разумее, наколькі гэта цяжка. Я не адчуваю з яго боку ніякага ціску, ён не крытыкуе маю гульню, можа штосьці растлумачыць, і мне гэта падабаецца, таму што я адчуваю яго падтрымку. Люблю, калі бацькі прысутнічаюць на трыбунах, хоць раней усё было наадварот.

***— Якую галоўную параду даў вам бацька?***

— Раней у мяне былі праблемы з хваляваннем. Тата заўсёды кажа: «Не думай пра тое, што ты хвалюешся, і што будзе, калі прайграеш. Думай пра тое, якую гульню павінна паказаць, як хочаш згуляць». Цяпер у нас нават атрымалася патрэніравацца разам: на час каранціну мы пераехалі ў загарадны дом у Жодзіне, разам з братам і татам займаліся ў трэнажорнай зале, бегалі.

***— Дзякуючы спорту вам давялося хутка пасталець?***

— Так, я вельмі рана стала ездзіць на турніры адна, без трэнераў і бацькоў. Памятаю, паехалі з іншымі тэнісістамі ў Каір, жылі ў нейкім гатэлі, які знайшлі самі. Корты размяшчаліся даволі далёка, ездзілі туды на таксі, таму што нават суддзі, якія працавалі на гэтым турніры, папярэдзілі нас пра тое, што перамяшчацца пешшу там даволі небяспечна. У 16 гадоў адна паляцела ў Ізраіль, прыляцела якраз у суботу, калі яшчэ не скончыўся шабат, грамадскі транспарт не хадзіў, а мне трэба было дабрацца ў суседні горад. Пашанцавала з'ехаць на апошнім аўтобусе з трыма перасадкамі. Гэта загартоўвае характар, ды і на матчах, калі ездзіш на турніры адна, разумееш, што ўсё залежыць толькі ад цябе, ніхто не зможа дапамагчы, і разлічваеш толькі на свае сілы.

***— У якім узросце вы атрымалі свой першы грашовы прыз?***

— Недзе па 200 долараў стала зарабляць з 14-15 гадоў. Траціла іх на свае патрэбы — тэнісная форма, красоўкі, ракеткі.

***— Калі плануеце перайсці на ўзровень турніраў Вялікага шлема?***

— Усё будзе залежаць ад мяне, з прычыны сваіх пакуль не ідэальных фізічных кандыцый разумею, што трэба яшчэ папрацаваць, каб гуляць на турнірах высокага ўзроўню. Спадзяюся, траплю туды ў наступныя паўтара—два гады.

***— Якія плюсы і мінусы адзначыце ў сваёй гульні?***

— Мой галоўны плюс — удар злева па лініі, добрая дыяганаль і хуткасць, я досыць хутка перасоўваюся па корце. Але ведаю, што яшчэ трэба прыбавіць у сіле, у падачы і ўдары справа. Работы шмат.

***— Кім з тэнісістак вы захапляецеся?***

— З дзяцінства — Вікай Азаранка, яе характарам. Па стылі мне падабаюцца Сімона Халеп і Каралін Вазняцкі.

***— Пра што марыце ў тэнісе?***

— Хацелася б выйграць турнір Вялікага шлема.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

**Фота з асабістага архіва гераіні.**



Ганна з бацькам.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні вы можаце атрымаць прывабныя дзелавыя прапановы. Імаверныя знаёмствы з карыснымі людзьмі. Калі будзеце дастаткова сканцэнтраваныя і ўважлівыя, то вам забяспечаны поспех у прафесійнай сферы. Намячаецца вырашэнне, хоць і крыху балючае, сур'ёзнай праблемы, якая даўно вас хвалюе. Магчыма, з'явіцца шанц знайсці крыніцу дадатковага заробку. У зносінах з блізкімі людзьмі будзьце максімальна тактоўныя, сямейныя сваркі зараз непатрэбныя.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні звяртайце асаблівую ўвагу на зносіны з процілеглым полам. Гэта трэба не толькі для асабістага жыцця, але і для кар'еры. Можа парадаваць нечаканае прызнанне вашых прафесійных заслуг. У чацвер і пятніцу ўпэўненасць ва ўласных сілах зробіць усё за вас. У нядзелю варта перагледзець стратэгію адносін з сваякамі, у першую чаргу — з дзецьмі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Цярпенне, спакой і вера ў лепшае дапамогуць дамагчыся жаданай мэты. Проста рабіце тое, што прыносіць задавальненне, і нават не заўважыце, як усе перашкоды на вашым шляху да шчасця знікнуць. Спраўдзяцца нават тыя мары, якія здаваліся недасяжнымі. Вас чакаюць прызнанні ў каханні і мноства прыемных падарункаў. Устройце для сябе і блізкіх свята — вы яго заслужылі.

**РАК.** Пакажыце навакольным свае найлепшыя якасці, іх абавязкова ацэняць. Ваша непрадказальнасць чароўная, але яна часам можа стамляць. У сераду не варта рабіць стаўку на мінулыя адносіны — вас чакае новае каханне. Не спрабуйце вырашыць свае і чужыя праблемы адным махам, інакш да канца тыдня адчуеце заняпад сіл. У суботу старанна абдумвайце свае словы, перш чым выказвацца.

**ЛЕЎ.** Не грэбуйце дробязямі: вырашэнне, здавалася б, нязначных пытанняў можа даць нечаканы станоўчы вынік. Пажадана перастаць растварацца ў патоках эмоцый і ўзяцца за справу. Але варта добра ўсё прадумаць, бессістэмныя крокі поспеху не прынясуць. Пошук новай работы ў чацвер можа завяршыцца поспехам. У асабістым жыцці не выключаныя рэўнасць і сваркі.

**ДЗЕВА.** У пачатку тыдня лепш менш гаварыць і больш рабіць. Не завісаць у сацсетках, віртуальныя зносіны аднімаюць час, але мала чым узбагачаюць. Да таго ж вас там можа напаткаць добра замаскіраваны падман. У сераду давядзецца дзейнічаць спантанна, паспрабуйце не губляць галавы. У выхадныя вашы планы могуць раптам змяніцца — гэта, хутчэй за ўсё, будзе звязана са шматабяцальнымі паездкамі або сустрэчамі.

**ШАЛІ.** Надыходзячы тыдзень спакойным не будзе, давядзецца імгненна рэагаваць на зменлівую сітуацыю. Будзьце больш мабільныя, не бойцеся перамен. Вельмі важна пастаянна быць на сувязі і не спазняцца. Сябры ахвотна дапамогуць, можаце разлічваць на іх параду, час і нават збольшага на фінансы. Ад вашай ініцыятыўнасці асабліва шмат будзе залежаць у чацвер. Пятніца спрыяльная для афармлення дакументаў і дамоваў. У гэты дзень пачнуць плаўна і паспяхова развівацца, здавалася б, невыканальныя праекты.

**СКАРПІЁН.** Удалы тыдзень. Інтуіцыя дазволіць знайсці карысныя сувязі нават сярод натоўпу выпадковых людзей, зрабіць важны прафесійны выбар. Вы зможаце здабыць душэўную раўнавагу, адчуць упэўненасць ва ўласных сілах і вызначыць мэты на найбліжэйшую будучыню. Не распыляйцеся, засяродзьцеся на самым галоўным і важным. Вас чакаюць поспех у справах і прыбытак, але не забывайцеся і пра задавальненні, якія дораць каханне, пяшчота і клопат. Устройце спатканне, парадуйце свайго выбранніка. Гэта будзе незабыўна і натхняльна.

**СТРАЛЕЦ.** Вашы ініцыятыва і настойлівасць дазволяць пераадолець усе падводныя камяні тыдня. Не выключаны блытаніна і змена прыярытэтаў. Не хвалюйцеся — усе змены да лепшага. Серада — вельмі ўдалы дзень для спраў, якія можна хутка скончыць. У канцы тыдня, падобна, давядзецца змагацца з раздражненнем і настройвацца пазітыўна. Гэта шлях да поспеху. Нядзелю пажадана прысвяціць сям'і і дому.

**КАЗЯРОГ.** Панядзелак можа парадаваць добрымі падзеямі. У аўторак і чацвер на рабоце лепш не прыцягваць да сябе ўвагі. Паспрабуйце лішні раз не трапляцца на вочы начальству. Сачыце за тым, каму і што кажаце, інакш можаце сутыкнуцца з праблемай скажонай інфармацыі. Паглыбляючыся ў праблемы, не забывайце пра дом. Заплануйце паездку на дачу, пікнік на прыродзе.

**ВАДАЛІЎ.** У пачатку тыдня магчымы істотныя, але пераадольныя цяжкасці. Непрадбачаныя затрымкі і неймаверныя спазненні могуць панізіць ваш аўтарытэт, а тлумачэнні нічым не дапамогуць. Ваша ўпартасць і ганарыстасць пагражаюць зацягнуць сітуацыю на працяглы тэрмін або прывесці да непажаданых перамен. Праявіце гнуткасць, прадэманструйце гатоўнасць дамаўляцца, тады адчуванне гармоніі прыйдзе як вынік вырашэння праблем. У выхадныя займіцеся ўладкаваннем дома або дачы.

**РЫБЫ.** Уключаючыся ў работу над рэалізацыяй чужых планаў, вам варта адэкватна разлічваць сілы і магчымасці, ды і свой інтарэс. Вы будзеце схільныя іх перабольшваць. Наступствы ж такой памылкі прадбачыць нескладана. Па магчымасці выяўляйце стрыманасць і дыпламатычнасць. У пятніцу вас могуць заваліць работай, так што і выхадныя будуць пад пагрозай. Але ўсё ж не варта выплюхваць эмоцыі на навакольных. Паспрабуйце правесці больш часу ў коле сапраўды блізкіх людзей: расходаваць энергію на староннія — недазвольная раскоша.

## Даты | Падзеі | Людзі

**30 МАЯ**

У краіне

**1780** год — Кацярына II і аўстрыйскі імператар Іосіф II залажылі ў Магілёве царкву святога Іосіфа. Існуе паданне, што падчас закладкі каменя ў падмурак у Кацярыны II парвалася нітка жэмчугу. Прыдворныя кінуліся збіраць рассыпаныя каралі, але імператрыца забараніла гэта рабіць, сказаўшы: «Хай храм будзе выдатны, як гэты жэмчуг». Іосіфаўская царква была пабудавана ў 1798 годзе, а набыла статус сабора ў 1802-м. Гэта быў першы беларускі помнік, створаны ў стылі класіцызму. Сабор дзейнічаў да 1929-га і быў узарваны ў 1938-м.



**1910** год — нарадзілася Марыя Паўлаўна Маркоўская, актрыса, заслужаная артыстка Беларусі (1966). У 1919—1934 гадах працавала ў цырку і на эстрадзе ў Кіеве, Растове-на-Доне, Мінску. З 1938-га — у Беларускім тэатры імя Якуба Коласа.

У гэты ж дзень нарадзіўся Анатоль Міхайлавіч Трус, акцёр, народны артыст Беларусі (1955). Служыў у Беларускім тэатры імя Якуба Коласа.

**1930** год — заснаваны НДІ фтызіятрыі, артапедыі і неўралогіі (цяпер — БелНДІ траўматалогіі і артапедыі).

**1995** год — падпісаны ўказ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «аб адмене мытнага кантролю на дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй».

У свеце

**1814** год — краіны антынапалеонаўскай кааліцыі (Расія, Вялікабрытанія, Аўстрыя і Прусія) падпісалі з Францыяй Парыжскі мірны дагавор. Пазней да яго далучыліся Швецыя, Іспанія і Партугалія. Дагавор прадугледжваў аднаўленне незалежнасці Галандыі, Швейцарыі, нямецкіх княстваў і італьянскіх дзяржаў.

**1930** год — нарадзіўся Павел Фёдаравіч Ніканаў, народны мастак Расійскай Федэрацыі, правадзейны член РАМ. У гісторыю жывапісу ўвайшоў як наватар, адзін з пачынальнікаў так званага суровага стылю. Аўтар карцін «Рыбакі», «Кастрычнік», «Нашы будні», «Геолагі», «Масква святочная», серыі пейзажаў сярэдняй паласы Расіі.



**1934** год — нарадзіўся Аляксей Архіпавіч Лявонаў, лётчык-касманаўт, двойчы Герой Савецкага Саюза. Ён першы выйшаў у адкрыты космас (1965) і першы працягнуў руку на арбіце амерыканскім астранаўтам (1975).

**1975** год — у Парыжы прадстаўнікі 10 краін падпісалі пагадненне аб стварэнні Еўрапейскага касмічнага агенцтва (ЕКА).

**1990** год — у Вашынгтоне пачалася амерыкана-савецкая сустрэча на найвышэйшым узроўні, якая праходзіла да 4 чэрвеня.

**КАНСТАНЦЫЯ БУЙЛО:**

*Маладосць! Ты маеш дзён багата,*
*Ты іх, бесклапотная, не лічыш;*
*Толькі старасць разумее страту:*
*Мала — ды ні ў кога не пазычыш.*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.46 | 21.29 | 16.43 |
| Віцебск | 4.28 | 21.26 | 16.58 |
| Магілёў | 4.36 | 21.19 | 16.43 |
| Гомель | 4.41 | 21.07 | 16.26 |
| Гродна | 5.03 | 21.43 | 16.40 |
| Брэст | 5.12 | 21.35 | 16.23 |

**Месяц**

***Першая квадра ў 6.29. Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Ефрасінні, Дамініка, Сцяпана.*
***К.*** *Жанны, Марыі, Яна.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Тэорыю ў нашай групе ўсе здалі, а вось на кіраванні адну бландзінку выгналі — папалася са шпаргалкай. На далоньцы падказку напісала і ўвесь час грыўку прыбірала.

— Цікава, што ж у яе было напісана?

— «Педаль тормаза пасярэдзіне»!

**Люблю свайго, пешчу.**
**Вось напісала запіску:**
**— Каханы, на вячэру пельмені. Грошы на стале. Пельмені ў краме. Каструля ў шафцы. Вада ў кране!**

Трохгадовы ўнук:

— Бабуля, нарадзі мне брацiка!

— Ну... гэта пытанне не да мяне, а да тваіх бацькоў.

— Пытаўся ўжо. Сказалі, ад бабулі залежыць.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1452.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 29 мая 2020 года.